Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 58 (5732) | 11 сакавіка 1937 г., чацвер | ЦАНА 10 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

РАШЭННІ ПЛЕНУМА ЦК ВКП(б) — ПРАГРАМА ПЕРАБУДОВЫ ПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ.

ПЕРАДАВЫ АРТЫКУЛ — Перад веснавой сяўбой.

Акад. **С. Я. Вальфсон** — Філосафскае завяшчанне Леніна.

В. К. Кін — Фінансавая гаспадарка і ўчот у калгасах.

Е. Бутомаў — Ачагі вайны.

Арк. Зарубежны — Засмечанасць сіроцінскага райвыканкома.

М. Ярчак — Зідзекі над стаханаўкай Вінакуравай.

С. Галкін — Подлыя дзеянні зграі дзурушнікаў.

Праф. **Ю. Іргер** і доктар **І. Стэльмашонак** — Пераліванне крыві.

За рубяжом:

Зварот ЦК французкай компартыі да II інтэрнацыянала.

На франтах у Іспаніі.

Пленум ЦК іспанскай компартыі.

Італьянскія дывізіі пад Мадрыдам.

У Лонданскім камітэце.

ПЕРАД ВЕСНАВОЙ СЯЎБОЙ

Стаханаўцы социялістычных палёў змагаюцца за большавіцкую падрыхтоўку да сяўбы. Орджанікідзенскі заклік рабочых Данбаса ўскалыхнуў новыя слаі калгаснікаў, узняў іх на стаханаўскую работу. На жаль, у раёнах гэты рух не заўважылі, не падтрымалі і не арганізавалі яго. Панае яшчэ ўяўленне, што стаханаўцы ўсё зробяць самі. Гэта беспардонная пазіцыя яўна адлае апартуністычным душком. Кіраўнікі раёнаў забыліся, што стаханаўцамі трэба кіраваць, іх трэба берагчы і падтрымліваць, і толькі тады гэты рух прынясе неабходныя рэзультаты.

Не гледзячы на тое, што да сяўбы асталіся лічаныя дні, у раёнах аб сяўбе мала думаюць. Сакратары райкомаў ад сяўбы адсталі, а райсоветы да яе не прысталі. Фактычна пасеўная кампанія, падрыхтоўка да яе ва многіх раёнах асталася без кіраўніцтва. Гэта выклікае сур'ёзную трывогу.

Калгаснікі ў сваіх пісьмах, прысылаемых у рэдакцыю, сігналізуюць аб слабай падрыхтоўцы да сяўбы, аб невыкананні самых неабходных мерапрыемстваў, забяспечваючых пасеўную кампанію. З Клімавіцкага раёна ідуць сігналы аб псаванні насенных матэрыялаў. У калгасе «Рабочы», Кісялевабудзянскага сельсовета змерзла 1.000 пудоў бульбы. У радзе калгасаў раёна зрываецца рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Загадчык райза тав. Рудчанка строчыць не мала цыркуляраў, але зачастую не ведае, што робіцца ў калгасах, як рыхтуюцца да пасеўнай. Звенні высокага ўраджаю ствараюцца ў калгасах стыхійна, ім не дапамагаюць, імі не кіруюць, а гэта прыводзіць да казусаў. Так, напрыклад, у калгасе «КІМ» Красавіцкага сельсовета арганізаваныя стаханаўскія звенні абавязаліся атрымаць ураджай... ніжэй плануемага сярэдняга ўраджаю па раёну. Аграномы, якія павінны адыграць выключную ролю ў барацьбе за сталінскія 7—8 мільярдаў пудоў хлеба, займаюцца чым угодна, толькі не сваёй асноўнай справай. Ці не думае сакратар Клімавіцкага райкома, што ён не адказвае за такое становішча спраў, ці не думае ён, што райком будзе аслабанён ад адказнасці, калі пасеўная кампанія сарвецца ў раёне?

Старшыня калгаса «КІМ» Заслаўскага раёна т. Мікульчык аб падрыхтоўцы да сяўбы гаворыць даволі многа, але жывых большавіцкіх спраў у калгасе вельмі мала. Пасеўны план да брыгад не даведзен. Колькі, за які тэрмін трэба будзе пасеяць, за які ўраджай змагацца — аб гэтым ніхто нічога не ведае. Зрываецца вывазка торфу і мінеральных угнаенняў. Можна налічыць нямала фактаў варварскіх адносін да каня.

Калгас «Социялістычны шлях» знаходзіцца пад бокам крычаўскіх раённых арганізацый. Можна было падумаць, што крычаўскі райза, РВК і горсовет паклапаціліся зрабіць гэты калгас узорам для іншых. Але нічога падобнага. Калгас нават не прыступіў да вывазкі гною, торфу і вапны. Збіраць птушыны памёт, фекалій, жыжу не намераны. Дрэнна арганізован выхад на работу, няправільна размеркаваны вытворчыя ўчасткі, зрываецца севазабарот... І не толькі ў адным калгасе «Социялістычны шлях» такое становішча з падрыхтоўкай да сяўбы. Такіх калгасаў у Крычаўскім раёне нямала.

Сакратары Заслаўскага, Хойніцкага, Крычаўскага і іншых раёнаў рашылі, відаць, зваліць усю падрыхтоўку да сяўбы на райвыканкомы, не праверыўшы нават, ці выцягнуць яны гэту справу, не паклапаціўшыся аб неабходнай расстаноўцы сіл. Можна і трэба перадаць усё аператыўнае кіраўніцтва падрыхтоўкі да пасеўнай райвыканкому, калі там сядзяць людзі моцныя, аператыўныя, здольныя забяспечыць поспех справы. Але нават і ў гэтым выпадку зусім ухіляцца ад работы нельга. Трэба пільна сачыць за падрыхтоўкай, чула і хутка палітычна рэагаваць на ўсе недахопы ў арганізацыі сяўбы, пакінуўшы за сабой палітычнае забеспячэнне падрыхтоўкі, арганізацыю мас, палітычнае кіраўніцтва стаханаўскім рухам. Тым больш нельга перадаваць палкам і поўнасцю справы райвыканкому, калі ён неаператыўны, слабы. Над совецкімі кадрамі ў такім раёне трэба многа працаваць, дапамагаць ім, вучыць іх на прыкладзе, паказваючы як трэба аператыўна вырашаць пытанне, каб вырасціць з іх сапраўдных кіраўнікоў гаспадаркі, на якіх потым можна перакласці такую работу. Так партыя і таварыш Сталін вучыць нас вырашаць пытанні.

Калі совецкая рэспубліка будавала сваю прамысловасць, большавікі, закасаўшы рукавы, біліся па гаспадарчым фронце, авалодваючы тэхнікай, выхоўваючы і абучаючы людзей. Цяпер гэтыя кадры створаны, апека не толькі не патрэбна, але і шкодна.

Будуючы соўгасы, калгасы і МТС, партыя працавала над стварэннем гаспадарчых кадраў социялістычнай сельскай гаспадаркі. І тут атрыманы буйныя перамогі. Але сельскагаспадарчыя кадры маладзей, менш вопытны, іх яшчэ патрэбна вучыць і выхоўваць. Гэта павінны рабіць партарганізацыі, і тым грунтоўней яны павінны біцца за кадры, іх навучанне і выхаванне, чым яны слабей. Таму абсалютна няправільна робяць тыя сакратары райкомаў, якія шарахнуліся зараз у бок, закінулі кіраўніцтва гаспадаркай, кінуўшы нявопытных і апякаўшыхся да гэтага часу ва ўсім гаспадарнікаў у соўгасах, МТС, калгасах, як сляпых кацянят, не ведаючых куды ім прыткнуцца і з чаго пачаць.

Наркамзем пры ўсім гэтым павінен неадкладна змяніць практыку сваіх узаемаадносін з райкомамі. Наркамзем БССР не павінен ігнараваць свае кадры, не можа абыходзіць іх. Пара Наркамзему ў сваёй рабоце па-сапраўднаму, адказна абаперціся на свае кадры, пара яму пачаць сапраўдную работу па выхаванню і навучанню загалчыкаў райземаддзелаў, аграномаў і землямераў. Пара Наркамзему і яго органам будаваць сваю работу так, каб усю паўнату адказнасці за ход земляробчых работ узяць на сябе.

Да пачатку палявых работ асталося зусім мала часу. Ясна, што малейшае замаруджанне ў мабілізацыі калгасных мас на сканчэнне падрыхтоўкі да сяўбы можа застаць некаторыя калгасы непадрыхтаванымі да эфектыўнай барацьбы за высокі ўраджай.

Трэба абвясціць бязлітасную барацьбу зазнайству, самасупакзенню. Бліжэйшыя тыдні літаральна рашаючыя. Трэба дапамагчы калгасам арганізаваць барацьбу за неадкладнае сканчэнне вывазкі ўсіх відаў угнаенняў, давядзення сур'ёзна прадуманых планаў да кожнай брыгады і звяна, за падрыхтоўку і правільную расстаноўку кадраў, за сканчэнне гатункавамену і поўнай засыпкі высокаякаснага кандыцыйнага насенняга матэрыялу, да правядзення раду мерапрыемстваў па догляду за азімымі пасевамі.

Асобна трэба сказаць наконт каня. Рад сігналаў з месц паказваюць, што ва многіх калгасах няма барацьбы за падрыхтоўку да вясны моцнага каня. Трэба гэта зразумець да канца. Самая жорсткая барацьба павінна быць абвешчана фактам варварскіх адносін да каня, фактам разбазарвання кармоў і браніраваных фондаў.

Палітычна-масавая работа сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў набывае цяпер самае актуальнае значэнне. Кожны высковы комуніст павінен стаць сапраўдным большавіцкім арганізатарам мас на барацьбу за высокі ўраджай. Толькі пры гэтай умове мы здолеем усё шырэй разгарнуць стаханаўскі рух у калгасах. Не падмяняць райземаддзелы і советы, а стаць сапраўднымі палітычнымі кіраўнікамі мас — вось у чым задача кожнай партыйнай арганізацыі.

У нас ёсць яшчэ такія, з дазволу сказаць, кіраўнікі, якія гатовы масавую работу з калгаснікамі замяніць многа раз асуджаным партыяй адміністраваннем, камандаваннем. Такія «кіраўнікі» асабліва цяпер могуць панесці непаправімую шкоду. З гэтым злом трэба змагацца бязлітасна. Трэба свята ахоўваць прынцыпы калгаснай дэмакратыі, асновы сталінскага статута сельскагаспадарчай арцелі.

Дапамагчы калгаснікам разгарнуць здаровую большавіцкую крытыку і самакрытыку ўсіх недахопаў у калгасе, бязлітасна грамім малейшую спробу парушэння статута сельгаеарцелі, мабілізаваць і ўзначаліць ініцыятыву калгасных мас на барацьбу за высокі ўраджай, за ўзорную падрыхтоўку да вясны, за сталінскія 7—8 мільярдаў пудоў хлеба — важнейшая задача бліжэйшага часу.

Вывучэнне рашэнняў пленума ЦК ВКП(б) комуністамі Кагановіцкага раёна горада Менска. НА ЗДЫМКУ: загадчык партгабінета Кагановіцкага райкома тав. Ліўшыц праводзіць заняткі з прапагандыстамі прадпрыемстваў. На занятках прысутнічаюць тт. Базыленка, Гірко, Дубінін, Сокалава, Кіслік, Каменецкі, Малаў, Пілюшэнка

Фото Я. Салавейчыка.

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) — праграма перабудовы партыйнай работы

ДАКУМЕНТ, ЯКІ ПАВЫШАЕ БОЕЗДОЛЬНАСЦЬ ПАРТЫІ

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) маюць для ўсёй нашай партыі і социялістычнай краіны надзвычайнае гістарычнае значэнне. Яны ставяць перад усёй партыяй задачы праверкі гатоўнасці ўсіх звенняў партыі да кіраўніцтва ўзрослай актыўнасцю працоўных мас горада і вёскі, якая ўзнята Сталінскай Канстытуцыяй. Для таго каб кіраваць масамі трэба ў першую чаргу актывізаваць усіх комуністаў. Гэта значыць, ва ўсіх звеннях нашай партыі павінна быць забяспечана строгае правядзенне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі — асноўнага арганізацыйнага прынцыпа большэвізма. Павінна быць забяспечана шырокае разгортванне большавіцкай крытыкі і самакрытыкі.

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) з вялікай цікавасцю і ўзлымам абмяркоўваюцца і вывучаюцца ўсімі комуністамі акруговай партарганізацыі, яны з задавальненнем чытаюць пастанову пленума аб выключэнні з партыі Бухарына і Рыкава, гэтых заклятых ворагаў народу і партыі, гэтых прэзрэнных рэстаўратараў капіталізма. Вывучэнне рашэнняў пленума выклікае ў комуністаў пачуццё яшчэ большай адказнасці за даручаны ўчастак работы, і яно ўзніме іх актыўнасць у партжыцці.

Адзначаныя ў пастанове пленума факты грубага парушэння статута партыі і асноў унутрыпартыйнай дэмакратыі мелі месца ў радзе партарганізацый Мазырскай акругі. Мазырскі райком партыі, напрыклад, з 1934 да 1937 г. ні разу не пераабіраўся. З 24 членаў райкома, абраных III райпартканферэнцыяй, да моманту перавыбараў асталося толькі 6 чал. Усе астатнія былі каптаваны. Тураўскі райком партыі таксама да перавыбараў саставу сваёй большасці з каптаваных членаў.

Рад парторгаў пярвічных партарганізацый прызначаліся райкомам, замест абрання іх на сходах. Так парторгі пярвічнай арганізацыі завода «Пролетарый» Мазырскага раёна да правядзення абмену партдакументаў не абіраліся. Яны пасылаліся туды райкомам партыі і адразу-ж прыступалі да работы. Парторг пярвічнай партарганізацыі Азарыцкага местсовета Дманавіцкага раёна т. Пеклах таксама працаваў, не будучы абраным на працягу 6 месяцаў. У пярвічнай арганізацыі завода «Чырвоны Кастрычнік» Мазырскага раёна за 2 гады змянялася 6 сакратароў парткома, прычым адзін з іх Тлішчанка нават не быў абран партарганізацыяй. Сакратары парткомаў, уходзячы з работы, як правіла, справаздачы аб сваёй рабоце на партсходах не рабілі.

Усе гэтыя факты мелі месца таму, што партработа ў радзе партарганізацый была на нізкім узроўні, не былі разгорнуты ў дастатковай ступені метады большавіцкай крытыкі і самакрытыкі, што мае месца ў некаторых райпартарганізацыях і да апошняга часу.

Большэвіцкая пільнасць у партарганізацыях акругі яшчэ далёка не на належнай вышыні. Яны не зрабілі для сябе адпаведных вываадаў з выкрытых нават пасля абмену партдакументаў фактаў аруйвання класавых ворагаў у партарганізацыях нашай акругі.

Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) даюць моцную зброю ў рукі нашай акруговай партарганізацыі для далейшага ўзлыму партыйнай работы і боездольнасці арганізацыі. Гэтыя рашэнні абавязваюць кожнага комуніста нашай партарганізацыі, якая працуе ў пагранічнай акрузе, яшчэ больш павысіць большавіцкую рэволюцыйную пільнасць, каб умець своечасова распазнаваць і выкрыць ворагаў народу, пад якой-бы маскай яны ні хаваліся.

С. М. РАМАНЕНКА.

Сакратар Мазырскага акруговага камітэта партыі.

Глыбока вывучаць рашэнні пленума

9 сакавіка на агульным партыйным сходзе комуністы завода імя Кірава глыбока вывучалі і абмяркоўвалі пастанову пленума ЦК ВКП(б) і на гэтай аснове разгарнулі крытыку недахопаў работы сваёй партыйнай арганізацыі.

— На працягу апошніх трох год не было ніводнай справаздачы партыйнага камітэта, — гаворыць тав. Тыліндус. — Члены партыйнага камітэта ўвесь час змяняліся. Са старога складу парткома зараз не асталося ні аднаго чалавека. На месца выбыўшых членаў парткома нам рэкамендавалі новых таварышоў, якіх мы зусім не ведалі, але галасавалі за іх. Такая практыка прыводзіла і ў нашай партыйнай арганізацыі да таго, што мы не ведалі кіраўнікоў партарганізацыі, а яны ў сваю чаргу не ведалі радавых членаў партыі. Калі абіралі тав. Шамеса ў партыйны камітэт і потым сакратаром парткома, ён нават нам не расказаў сваёй біяграфіі.

— Пасля ліквідацыі цэхавых груп, — гаворыць тав. Ноім, — партыйны камітэт яшчэ не перабудаваў сваю работу. Большасць комуністаў, асабліва былыя партыйныя арганізатары, не маюць партыйных даручэнняў. Далейшае разгортванне ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, тайнае галасаванне пры абранні партыйных органаў патрабуе ад нас, комуністаў, яшчэ больш высокай ідэйнай узброенасці, рэволюцыйнай пільнасці.

Тт. Купрыеў, Кацовіч, Сарокін і інш. у сваіх выступленнях указвалі, што партыйны камітэт яшчэ не наладзіў работу па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі сярод комуністаў і беспартыйных рабочых завода. Яны патрабавалі ад партыйнага камітэта, каб арганізаваць спецыяльныя гурткі па вывучэнню гэтага важнейшага дакумента.

Выказаўшыяся ў спрэчках таварышы падкрэслілі, што для глыбокага вывучэння пастаноў пленума ЦК нельга абмежавацца толькі партыйным сходам, а неабходна іх вывучаць у партыйных школах, каб кожны комуніст зразумеў усю палітычную важнасць гэтых важнейшых гістарычных пастаноў.

Усе выступаючыя аднадушна ўхвалілі пастанову пленума аб выключэнні з партыі здраднікаў радзімы Бухарына і Рыкава.

М. ВАГАНАВА.

УЗНІМЕМ АКТЫЎНАСЦЬ КОЖНАГА КОМУНІСТА

ПОЛАЦК. Як толькі ў Полацку былі атрыманы цэнтральныя газеты з паведамленнем аб пленуме ЦК ВКП(б), у той-жа дзень ва ўсіх прадпрыемствах горада ў час абедзенага перапынку і па сканчэнню работы партыйныя арганізацыі прыступілі да абмеркавання рашэнняў пленума.

«... У партыйнай арганізацыі акруговага аддзела сувязі вось ўжо год, як парторг не адчытваўся аб сваёй рабоце,—расказвае комуніст т. Юталь.—І не выпадкова, там адсутнічае большэвіцкая крытыка і самакрытыка. Так, на партыйным сходзе выступіў комуніст Радунскі, ён крытыкаваў дрэнную работу начальніка аддзела сувязі тав. Чэсных, і што-ж, праз некалькі дзён Чэсных дае загад, у якім абвінавачвае тав. Радунскага ледзь не ў шкодніцтве (ў той час, калі тав. Радунскі з'яўляецца выключна добрым работнікам).

«... За апошнія гады ў нашай партарганізацыі ў арцелі «Правда» змянілася тры парторгі,—гаворыць тав. Раскіна,—прычым, ні адзін з іх не палічыў патрэбным адчытацца перад комуністамі сваёй арганізацыі аб праробленай імі рабоце, расказаць як асобныя члены партыі працавалі, выконвалі партыйныя даручэнні. Радавыя комуністы да апошняга часу не актыўна выступалі на партыйных сходах, а калі хто і выступаў, то крытыкаваў работнікаў па рангу».

— З 1929 года ў партыйнай арганізацыі завода сельскагаспадарчых машын,—гаворыць комуніст т. Бялеў, — змянілася 10 парторгаў: Карыж, Галееў, Шмуйловіч І., Юшкевіч, ды ўсіх не запамятаеш. І не выпадкова, калі Юшкевіч аказаўся ворагам партыі, кулак, меў у мінулым 60 гектараў зямлі і ашуканчыя шляхам пралез у рады партыі і нават быў парторгам. Усё гэта здарылася таму, што райком не прыслухоўваўся да голасу радавых членаў партыі, якія супярэчылі супроць абрання яго парторгам.

... З 1934 года ў нас на заводзе не было ні адной справаздачы парторга,—расказвае Шмуйловіч. Парторгі мяняліся, не здолеўшы нават дэтальна вывучыць партыйную арганізацыю. Ні адзін комуніст не ведаў, як той ці іншы член партыйнага камітэта выконвае свае абавязкі, наколькі ён апраўдвае давер'е комуністаў.

Я сам працую год парторгам на заводзе сельгасмашын і ні разу яшчэ не рабіў справаздачы перад сваімі членамі партыі. Безумоўна, я віноўны ў гэтым, а яшчэ большая віна райкома партыі, які не прымаў ніякіх мер да парушальнікаў статута партыі.

Комуністы партарганізацыі з вялікім ухваленнем сустрэлі рашэнні пленума аб выключэнні з радоў партыі Бухарына і Рыкава — заклятых ворагаў партыі і народу, гэтых рэстаўратараў капіталізма, здраднікаў социялістычнай радзімы.

Тайнае галасаванне пры перавыбарах ў нізавыя партыйныя арганізацыі павысіць ўзлыме актыўнасць кожнага члена партыі, яшчэ вышэй ўзніме большэвіцкую крытыку і самакрытыку, рэволюцыйную пільнасць кожнага члена партыі.

МЕЖАРЫЦКІ.

Парторг полацкага завода сельгасмашын.

На ўсебеларускай нарадзе работнікаў прамысловасці будматэрыялаў

На ранішнім пасяджэнні працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Балціна.

— Сёлета аршанскі селікатны завод,— гаворыць т. Марчанка. — павінен даць 18 мільёнаў штук цэглы. Праграму, безумоўна, можна выканаць. Але-ж для гэтага неабходна падрыхтавацца. Між тым у нас ёсць яшчэ рад сур'ёзных недаробак. Новая кацельная не скончана, нехапае аднаго катла. Трэст палыхозіць механічна пры размеркаванні сродкаў на рамонт.

Тэхнарук цагельні № 18 (Петрыкаў) т. Забалотнік расказаў аб тым, як работнікі трэста, прыязджаючы на завод, не аказваюць ніякай практычнай дапамогі. Цагельня да сезона не падрыхтавана: вагаметкі запушчаны нехапае спілажнай плошчы, новая сушылка яшчэ не гатова.

Зусім мізэрная колькасць заводаў, выканаўшых план 1936 года. Але-ж нават і тыя, якія выканалі сваю праграму, дасягнулі гэтага за кошт лішняй рабочай сілы, звыштэрміновай работы і перавыткавалі фонд зарплаты. Такое становішча было і на заводзе № 14 (Гомель). Стаханаўскі рух тут быў разгорнут не на ўсіх працэсах вытворчасці. На прэсах нормы не выконваліся. Замест 27 тыс. штук цэглы за змену рабочыя давалі 21 тыс. Аб гэтым расказваў дырэктар завода т. Смалянскі.

Тав. Шамес — дырэктар завода № 39 (Горкі) расказаў аб кіраўніцтве трэстам сваімі заводамі.

—Я—новы чалавек у цагельнай прамысловасці, — гаворыць ён. Працую ўсяго 5 месяцаў. Прыязджаюць да нас людзі з цэнтра, лаюць і крычаць за дрэнную работу, а практычна не паказваюць, як трэба лепш арганізаваць работу.

Стаханавец завода № 5 (Менск) т. Герасімовіч расказаў аб сваім метадзе работы—абпалу на двух агнях.

— На заводзе № 8 (Магілёў), гаворыць стаханаўка Караткова,—нехапае інтэрнатаў для рабочых. Летась у нас 70 проц. рабочых былі стаханаўцамі, а зараз няма ні аднаго. Торфу няма, няма куды выгружаць гатовую цэглу для сушкі. Мы можам упаўне давесці сваю выпрацоўку да 35 тыс. штук цэглы, замест нормы ў 27. Мы патрабуем ад адміністрацыі стварэння нам неабходных умоў для работы.

Выказаліся таксама Малорскі (вапнавы завод № 1), Багдановіч (старшы абпальшчык завода № 2), дырэктар Промбанка т. Кейлін і інш.

На вячэрнім пасяджанні працавалі секцыі.

Рашэнні пленума узнімуць узровень партработы

ГОМЕЛЬ. (Кар. «Звязды»). Гомельская партарганізацыя з вялікім задавальненнем і аднадушным ухваленнем сустрэла гістарычнае рашэнне пленума ЦК ВКП(б), якое кладзе канец агідзнасцям, якія так часта назіраліся ў Гомелі. Тут шырока практыкавалася недапушчальная каптацыя новых членаў у партыйныя органы. У рэзультаце чаго ў самым гаркоме КП(б)Б большасць членаў гаркома аказаліся каптаванымі. Сакратары парткомаў, парторгі гадамі не рабілі справаздач перад сваімі арганізацыямі, выбары падмяняліся назначэннямі. Адным словам, партыйная дэмакратыя ў гомельскай партарганізацыі не карысталася асаблівай пашанай

Зараз пярвічныя партарганізацыі вывучаюць рашэнні пленума ЦК ВКП(б) і з дапамогай гэтых рашэнняў выкрываюць недахопы ў сваёй рабоце, намячаюць шлях да іх ліквідацыі, разгортваюць падрыхтоўку да практычнага ажыццяўлення дырэктыў пленума.

З асаблівым узлымам рашэнні пленума ўспрымаюцца радавымі членамі партыі. Вось што яны кажуць аб рашэннях пленума:

— Рашэнні пленума ЦК ВКП(б) узнімуць на небывалую вышыню партыйную работу, — кажа член партыі тав. Барысенка. — У пэнтры ўвагі будзе пастаўлен член партыі. Рашэнні пленума прымусяць кіраўнікоў строга прытрымлівацца прынцыпа дэмакратычнага цэнтралізма ў партыйных арганізацыях. Тайнае галасаванне дасць магчымасць абрань кіраўнікамі партыйных арганізацый сапраўды аўтарытэтных людзей.

З атрыманнем рэзалюцыі пленума ЦК ВКП(б) у гаркоме партыі была праведзена нарада сакратароў парткомаў і парторгаў гарадской партарганізацыі, на якой было распрацавана рашэнне пленума і намечан рад практычных мерапрыемстваў па дэтальнаму вывучэнню яго кожным членам і кандыдатам партыі.

Зараз праводзяцца партыйныя сходы на якіх абмяркоўваецца рашэнне пленума ЦК ВКП(б) і намячаюцца канкрэтныя мерапрыемствы па яго практычнаму ажыццяўленню.

Партарганізацыя і ўсе прапоўныя Гомельшчыны з велізарнейшым задавальненнем сустрэлі выключэнне правых контрэволюцыянэраў Бухарына, Рыкава з радоў партыі і патрабуюць найсуровейшага іх пакарання.

ЧЫКУН.

Акад. С. Я. ВАЛЬФСОН

ФІЛОСАФСКАЕ ЗАВЯШЧАННЕ ЛЕНІНА

(1922—12 сакавіка—1937 г.)

Заўтра спаўняецца 15-годзе з моманту, калі В. І. Леніным быў апублікаван артыкул «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізма» (гл. № 3 журнала «Пад сцягам марксізма» за 1922 г.). Гэты артыкул прынята называць філосафскім заявшчаннем Леніна. Гэта быў апошні дакумент, вышаўшы з-пад пяра Владзіміра Ільіча па пытаннях філасофіі. Ён пакладаўляў сабой сапраўдную праграму барацьбы за філасофію марксізма, дырэктывы аб задачах комуністаў на філасофскім фронце і ўзор большэвіцкай партыйнасці ў пытаннях тэорыі.

***

Ленін пачаў артыкул з указання аб неабходнасці для комуністаў весці барацьбу за філасофію марксізма, прыцягваючы да сумеснай работы ўсіх прыхільнікаў паслядоўнага і ваяўнічага матэрыялізма. Ленін пятрабаваў саюза комуністаў з паслядоўнымі матэрыялістамі — некомуністамі для паспяховай барацьбы з філасофскай рэакцыяй ва ўсіх яе розначастайных праяўленнях. Ён рашуча перасцерагаў ад сектанства ў галіне філасофскай работы: «Без саюза з комуністамі ў самых розных галінах дзейнасці ні аб якім паспяховым комуністычным будаўніцтве не можа быць і гуткі. Гэта адносіна і да той работы абароны матэрыялізма і марксізма, за якую ўзяўся журнал «Пад сцягам марксізма»*). Ленін патрабаваў, каб дзейнасць гэтага саюза была палкам накіравана на выкрыццё сувязі паміж класавымі інтарэсамі буржуазіі і ідэйным зместам модных філасофскіх плыняў, на праслежванне ўсіх «дыпламаваных лакеяў папоўшчыны», пад якім-бы выглядам яны ні выступалі.

Вялікую ўвагу ўдзяліў Владзімір Ільіч пытанню аб барацьбе з рэлігіяй і ўсякімі рэлігійнымі забабонамі, патрабуючы ад філасофскіх работнікаў весці пастаянную атэістычную прапаганду, будзіць масы ад рэлігійнага сну. Ён настойліва раіў выкарыстоўваць у гэтай барацьбе з папоўшчынай бойкую і таленавітую антырэлігійную публіцыстыку старых атэістаў XVIII стагоддзя. Ён настойваў таксама на супрацоўніцтве ў гэтай барацьбе з асобнымі прагрэсіўнымі вучонымі — прадстаўнікамі сучаснай навуковай крытыкі рэлігіі, хаця-б і непаслядоўнымі ў сваіх выкрыццях і абвяржэннях рэлігіі. Лічачы абавязковым супрацоўніцтва з падобнага роду вучонымі ў барацьбе з пануючымі рэлігійнымі мракабесамі, Ленін катэгарычна патрабаваў у той-жа час выкрыцця іх непаслядоўнасці, іх уступак рэакцыі: «...Комуністы і ўсе паслядоўныя матэрыялісты павінны ажыццяўляючы ў гэтай меры свой саюз з прагрэсіўнай часткай буржуазіі, няўхільна выкрываць яе, калі яна ўпадае ў рэакцыйнасць»**).

Асабліва значэнне надаў Ленін у сваім выступленні пытанням філасофскай барацьбы ў галіне прыродазнаўства. Ён выходзіў пры гэтым з таго факту, што жорсткая ломка, якую перажывае сучаснае прыродазнаўства, часта параджае розныя рэакцыйныя філасофскія плыні. Толькі знаходзячыся ва ўсеўзбраенні дыялектыка-матэрыялістычнай філасофіі, прыродавед можа пропістаць напіску рэакцыйных буржуазных ідэй, якому падвяргаецца ў наш час прыродазнаўства. Ленін распаўсюджваў і на галіну прыродазнаўства высунутае ім патрабаванне саюза комуністаў з некомуністамі, здольнымі змагацца з рэакцыйна-буржуазнымі ідэямі за матэрыялізм. Ён канкрэтызаваў яго ў даным выпадку як неабходнасць саюза з прадстаўнікамі прыродазнаўства — прыхільнікамі матэрыялізма, якія не баяцца адстойваць яго супроць філасофскіх хістанняў ідэалагічнага і скептычнага парадку. Завяшчаўшы комуністам — навуковым работнікам супрацоўнічаць з прагрэсіўнымі і дэмакратычнымі вучонымі, якія жадаюць і могуць абараняць навуку і матэрыялізм ад папоўшчыны і рэакцыі, і, паставіўшы задачу выхавання гэтых вучоных у духу дыялектычнага матэрыялізма. Ленін разам з тым заклікаў да бязлітаснай барацьбы з правадырамі рэакцыйных буржуазных поглядаў. Ленін паказаў, што з палобнага роду прыгоннікамі, якія прыкрываюцца мантыяй навуковасці і дэмакратызма, не можа быць іншых адносін, як перасячэнне іх шкодных, антынавуковай дзейнасці рабочым класам, які ажыццяўляе дзяржаўную ўладу.

У сваім філасофскім завяшчанні Ленін паставіў ва ўсю шырыню задачу авалодання матэрыялістычнай дыялектыкай, гэтай магутнай тэарэтычнай зброяй пазнання прыроды і грамадства і іх рэвалюцыйнага пераўтварэння. Ленін паставіў перад філасофамі-марксістамі цяжкую і складаную задачу «арганізаваць сістэматычнае вывучэнне дыялектыкі Гегеля з матэрыялістычнага пункту гледжання, г. зн. той дыялектыкі, якую Маркс практычна прымяняў, і ў сваім «Капітале», і ў сваіх гістарычных і палітычных работах, і прымяняў з такім поспехам, што цяпер кожны дзень прабуджэння новых класаў да жыцця і да барацьбы на Ўсходзе (Японія, Індыя, Кітай)... ...кожны дзень прабуджэння да жыцця новых народаў і новых класаў усё больш і больш пацвярджае марксізм»***).

Такавы заветы, якія Ленін даў у сваім артыкуле «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізма». Гэты артыкул увайшоў у жалезны фонд тэорыі марксізма-ленінізма, займаючы ў ёй ганаровае месца побач з самымі выдатнымі творамі Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна.

***

Ленінскі артыкул пісаўся ў першы перыяд НЭП'а, у перыяд некаторага ажыўлення капіталізма. То быў час ажыўлення і актывізацыі буржуазнай інтэлігенцыі, шматлікія прадстаўнікі якой пад прыкрыццём «дэмакратычнай» фразеалогіі, пад мантыяй мнімай навуковасці вялі на ідэалагічным фронце наступленне супроць дыктатуры пролетарыята, супроць ненавісной ім тэорыі марксізма-ленінізма.

Цяпер у нашай краіне ажыццёўлена ў асноўным першая фаза комунізма, сацыялізм. Наш рабочы клас, наша селянства, наша працоўная інтэлігенцыя ўзброёны гордым усведамленнем гістарычных перамог, дасягнутых у барацьбе за сацыялізм і ўвасобленых у Сталінскай Канстытуцыі. Сталінская Канстытуцыя з'яўляецца маральнай дапамогай і рэальным падспор'ем для працоўнага чалавецтва капіталістычных краін, якое вядзе барацьбу з фашысцкімі варварамі.

За гэтыя пятнаццаць год карэнным чынам змянілася становішча і на ідэалагічным фронце Совецкай краіны. Выкінуты за прадзелы нашай сацыялістычнай радзімы ў клаваку контрэволюцыйнай эміграцыі паны Выперы, Сарокіны, Лоскія, Бруцкусы і інш. дыпламіраваныя лакеі буржуазіі. На тэарэтычным фронце самааддана працуюць верныя партыі і яе Цэнтральнаму Камітэту навуковыя кадры, якія ў пераважнай большасці выраслі ў рэволюцыю і ёй выхаваныя. Іх ідэалагічнай зброяй з'яўляецца адзіная паслядоўна навуковая філасофія — дыялектычны матэрыялізм. Лепшыя з старых вучоных, перадавыя прадстаўнікі старой навуковай гвардыі СССР паспяхова засвайваюць метад дыялектычнага матэрыялізма, узбройваюцца металадалагічнымі прынцыпамі марксізма-ленінізма і прымяняюць іх у сваёй спецыяльнасці. Ідэалогія марксізма-ленінізма з'яўляецца пануючай у СССР.

Велізарны дасягненні і на філасофскім участку ідэалагічнага фронта. Разгромлены ідэалістычная містыка і мракабесе, якія прабавалі насаджаць і ў совецкіх умовах філасофскія чорнасоценцы тыпу Бердзяева або Лосева. Выкрыты і разгромлены антымарксісцкія рэвізіяністскія школкі меншавіцтвуючага ідэалізма і механіцызма, як правы ідэалогіі, якая змыкаецца з ідэалогіяй трацкісцкай банды і зграі Бухарына і Рыкава. Нанесен сакрушальны ўдар па «леваках» і ўпрашчэнцах з так называемай шабалкінскай групкі. У працэсе барацьбы з усімі гэтымі варожымі плынямі і на яе ўроках выраслі кадры філасофскіх работнікаў, жадаючых і ўмеючых змагацца з усякага роду скажэннямі марксізма-ленінізма за партыйную лінію ў філасофіі. Сярод шырокіх мас працоўных Совецкага Саюза наглядаецца вялікі інтарэс да пытанняў светапогляду, да пытанняў філасофіі. Творы класікаў філасофіі разыходзяцца ў небывала вялікіх тыражах. Класічныя філасофскія творы Маркса—Энгельса—Леніна—Сталіна робяцца здабыткам сотень тысяч працоўных, тэарэтычна ўзбагачаюць іх і ўзбройваюць на далейшую барацьбу за комунізм.

***

Усім гэтым перамогам, якія атрыманы на ідэалагічным фронце Совецкага Саюза і на яго філасофскім участку ў прыватнасці, мы абавязаны выкананню заветаў Леніна, абавязаны кіраўніцтву Цэнтральнага Камітэта і асабіста таварыша Сталіна.

Узбройваючы рабочы клас непераможнай зброяй маркса-ленінскай тэорыі, таварыш Сталін дае сакрушальны адпор усім і ўсялякім спробам тэарэтычнага разбурэння пролетарыята. Ён выкрывае гэтыя спробы, як посячыя класава-варожы характар, як непахісчыя ад вялікай усясільнай філасофіі марксізма-ленінізма ў балота здзяяцтва і вульгарштчыны.

Ягчэ на зары сваёй дзейнасці таварыш Сталін асобна падкрэсліваў пэласны характар марксізма, як светапогляд, значэнне яго філасофскай асновы. «Марксізм,— гаворыць ён, — не ёсць толькі тэорыя сацыялізма, гэта ёсць пэльны светапогляд. Філасофская сістэма, з якой лагічна вынікае пролетарскі сацыялізм Маркса. Гэта філасофская сістэма называецца дыялектычным матэрыялізмам». («Анархізм або сацыялізм». Газета «Ахалі цховрэба» № 2. 21. VI—1906 *). Усякія спробы філасофскага ліквідатарства і тэарэтычнага ўпраздніцельства выкрываюцца таварышам Сталіным, як накіраваныя супроць інтарэсаў рабочага класа, як заганяючыя яго ў палон да буржуазнай філасофіі, да буржуазнай навукі. Ва ўсіх выпадках, калі наша навуковая мысль адстае ад практыкі сацыялістычнага будаўніцтва, таварыш Сталін «палхлёствае» яе, патрабуючы ліквідацыі разрыву паміж практычнымі поспехамі і развіццём тэарэтычнай мысці, вызначае шляхі гэтай ліквідацыі. Лозунгам, які таварыш Сталін даў совецкім навуковым работнікам, з'яўляецца:

«...неабходна, каб тэарэтычная работа не толькі паспявала за практычнай, але і апярэджвала яе, узбройваючы нашых практыкаў у іх барацьбе за перамогу сацыялізма» **).

Гістарычная прамова таварыша Сталіна на канферэнцыі аграрнікаў-марксістаў 27 снежня 1929 г. паставіла з усёй сілай задачу ліквідацыі адставання тэарэтычнай работы ад практыкі ва ўсіх галінах навуковай работы. Яна высунула ва ўвесь свой рост задачу ўмацавання **большэвіцкай боездольнасці** ўсяго совецкага тэарэтычнага фронта і разгорнутага наступлення на ўсе праявы буржуазных, трацкісцкіх, меншавіцкіх і поўменшавіцкіх, народніцкіх і іншых класава-варожых тэорый, накіраваных супроць марксізма-ленінізма.

Сваёй гутаркай з бюро ячэйкі ІКП філасофіі і прыродазнаўства ў студзені 1930 года таварыш Сталін указаў шляхі адзараўлення філасофскага ўчастка нашага тэарэтычнага фронта. У гэтай гутарцы таварыш Сталін выкрыў палітычную і тэарэтычную сутнасць пазіцый дэборынскай групы як меншавіцтвуючага ідэалізма, выкрыў яе як адну з форм антымарксісцкай рэвізіі філасофіі марксізма-ленінізма ва ўмовах дыктатуры пролетарыята. Таварыш Сталін даў філасофскім работнікам паглыбленае разуменне ленінскага **этапа** развіцця дыялектычнага матэрыялізма, высунуў перад імі ў якасці важнейшай задачы распрацоўку і папулярызацыю таго новага, што Ленін даў ва ўсіх галінах марксізма, указаў як трэба вырашаць задачы суадносін практыкі і тэорыі, сувязі палітыкі з філасофіяй, прыкаваў іх увагу да вывучэння новых, сацыялістычных заканамернасцей, да распрацоўкі тэарэтычных пытанняў на падставе сацыялістычнай практыкі і ў непарыўнай сувязі з ёй, мабілізаваў іх на паслядоўную барацьбу за ленінскі прынцып партыйнасці філасофіі супроць усіх антымарксісцкіх установак. Перабудова філасофскага ўчастка, аказаўшая велізарны ўплыў на іншыя тэарэтычныя ўчасткі (біялогія, літаратуразнаўства, права і інш.), ажыццёўлена па дырэктывах і пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна.

***

Ахзначаючы тыя значныя поспехі, якія дасягнуты на філасофскім фронце ў справе ажыццяўлення ленінскіх заветаў, неабходна перасцерагчы ад якога-бы там ні было самазаспакаення і благадушша ў гэтых адносінах.

Вопыт паказаў, што работнікі філасофскага фронта далёка не заўсёды ягчэ знаходзяцца на тым узроўні большэвіцкай партыйнасці, якой патрабуе артыкул таварыша Леніна. Інакш не маглі-б ворагі народу розных масцей, у першую чаргу трацкісцкія прыхвасні фашызма і іх правыя суўзбнікі, акапавацца на філасофскім участку і выкарыстоўваць яго ў сваіх контрэволюцыйных рэстаўратарскіх мэтах.

Ягчэ не пастаўлена на належную вышыню філасофская асвета ў нашых навучальных установах, чаму Ленін надаваў асаблівае значэнне. Падручнікі па дыялектычнаму матэрыялізму маюць істотныя недахопы. Адсутнічаюць здавальняючыя праграмы.

Асобныя работнікі, кіруючыя жыццём вышэйшай школы, часамі недаацэньваюць ролю і значэнне дыялектычнага матэрыялізма ў справе падрыхтоўкі кваліфікаваных спецыялістаў розных галін гаспадаркі і культуры нашай сацыялістычнай краіны. Гэта недаацэнка з'яўляецца рэзультатам таго антымарксісцкага, антыленінскага зневажання філасофіі, якім пагрэшны асобныя практыкі, а часамі і дзяляцкі настроены навуковыя работнікі. Не прыходзіцца гаварыць аб тым яколькі падобнага роду зневажанне супярэчыць заветам Леніна і ўказаннням Сталіна.

У сучасны момант, калі Цэнтральны Камітэт і таварыш Сталін рэзка ставяць пытанне аб дапаўненні старога лозунга аб тэхнічным выхаванні новым лозунгам—аб аўладанні большэвізмам, аб палітычным выхаванні кадраў, пытанні шырокага распаўсюджвання філасофіі марксізма-ленінізма набываюць асаблівае значэнне.

Філасофскае завяшчанне Леніна напамінае нам і аб тым, што наша антырэлігійная работа ягчэ не знаходзіцца на неабходнай вышыні.

Бясспрэчна, што рэлігія адмірае, разлагаецца ва ўмовах перамогнага сацыялізма, што таюць кадры служыцеляў рэлігіі, што быстра знікаюць з паверхні нашай цудоўнай сацыялістычнай радзімы сумныя ачагі рэлігійнага дурмана—царквы, касцёлы, сінагогі — дзесяткі мільёнаў працоўных раз назаўсёды парвалі з рэлігіяй упэўніўшыся ў яе хлуслівасці і шкоднасці.

Аднак, не гледзячы на велізарныя поспехі па перамаганню рэлігіі, усё-ж лік веруючых і асабліва хістаючыхся людзей у нашай краіне яшчэ значны. Рэлігійнікі ўсяляк ухітраюцца ў спосабах распаўсюджвання ў масах «божаскай» атруты. Яны праяўляюць у гэтых адносінах вялікую, так сказаць, манеўранасць. Яны прабуюць выкарыстаць у сваіх інтарэсах і прадастаўленне выбарчых правоў служыцелям культу.

Усё гэта красамоўна гаворыць аб тым, што нельга прадаставіць рэлігію «самаадміранню», што з нашага боку, як з актыўных членаў сацыялістычнага грамадства, патрабуецца барацьба з рэлігіяй. Але барацьба гэта зусім не павінна насіць «лявацкага» адміністрацыйнага характару. Мы павінны змагацца з рэлігіяй не шляхам адміністрацыйных мерапрыемстваў, а растлумачальнай работай. Антырэлігійнікі павінны цярпліва, удумліва, не зневажаючы пачуцці веруючых, паказаць ім усю шкоднасць, якую рэлігія прыносіць працоўным, даказаць ім, што рэлігія адыгрывае ў руках капіталістычных эксплаататараў і дрэнежнікаў ролю зброі, якая дапамагае ім знявольваць, прыгнятаць мільёны людзей, ушэўніць іх у тым, што рэлігійныя выдумкі палкам абвяргаюцца навукай.

Сталінская Канстытуцыя, забяспечваючы ўсяму совецкаму народу культурнае і заможнае радаснае жыццё, пазбаўляе рэлігію ўсякіх пажыўных крыніц. Яна прадастаўляе нам магчымасць развіць магутную навуковую антырэлігійную прапаганду, якая вырве з-пад улады рэлігіі яе апошнія рэзервы. Да гэтага нас абавязваюць і заветы Леніна.

У заключэнне неабходна адзначыць велізарнае **міжнароднае значэнне**, якое набывае ў сучасны момант філасофскае завяшчанне Леніна. У краінах капіталізма навука перажывае найпяжэйшы крызіс, навуковая мысль знаходзіцца ў тупіку. Гніенне буржуазнай навукі зайшло вельмі далёка. Фашызм ажыццяўляе канібальскі паход супроць навукі, процістаўляючы навуковаму названню містычныя «расавыя» брэдні, навуковаму факту — «міф крыві». У той-жа час сярод прагрэсіўнай навуковай інтэлігенцыі ўзмацняецца цяга да матэрыялізма, наглядаецца набліжэнне да марксізма. Ле лепшыя прадстаўнікі пярэдка пераходзяць на пазіцыі пролетарыята.

У такой абстаноўцы філасофскае завяшчанне Леніна дае верны компас у рукі брацкіх комуністычных партый, дапамагаючы ім арганізаваць адпор праяўленням рэакцыі на навуковым фронце і аб'яднаць у барацьбе з рэакцыяй на аснове барацьбы за паслядоўны матэрыялізм лепшых дэмакратычных і прагрэсіўных вучоных.

Напісаны пятнаццаць год назад артыкул Леніна захоўвае па сучасны момант велізарнейшае дзейснае значэнне для нашай барацьбы за ваяўнічы матэрыялізм, за вялікае і непахіснае вучэнне Маркса — Энгельса — Леніна — Сталіна.

*) **В. І. Ленін.** Збор твораў. Т. XXVII. стар. 180.

**) Там-жа, стар. 185.

***) Там-жа, стар. 187.

*) **Л. Берыя.** Да пытання аб большэвіцкіх арганізацыях у Закаўказзі. «Большэвік» 1935 г., № 14. стар 92-3

) **Сталін, «Пытанні ленінізма», выд. X, стар. 299.

ПОДЛЫЯ ДЗЕЯННІ ЗГРАІ ДВУРУШНІКАЎ

(З залы суда)

ЛЕПЕЛЬ, 10 сакавіка (па тэлефону). Раніцяе пасяджэнне суда пачалося бёнця з допыту былога загалчыка райфа Русанава. Наскрозь фальшывы, хітры, ён выкручваецца, цвёрда рашэўшы скрыць праўду. Асноўная мэта Русанава—звесці сваю віну толькі да халатнасці, да недастатковага кантролю за парадкам снаганння палаткаў у сельсоветах.

Але факты — упартая рэч. Факты гавораць, што масавыя вобыскі, штрафы і адабранне маёмасці рабіліся не толькі з ведама Русанава, але па прамых яго распараджэннях. Факты гавораць, што Русанаў быў адным з тых, якія асабіста ўзначальвалі ўсе гэтыя печуваныя злачынствы і здзекі з насельніцтва. У вёсцы Фролава, Варонскага сельсовета ўсе памятаюць, як Русанаў асабіста з'явіўся ў хату да маткі чырвонаармейца Шавалды Анастасіі, за якой лічылася недоімка ў 320 руб., і забраў у яе замест гэтай сумы 800 рублёў. Розніцу Русанаў палічыў магчымым не вярнуць Шавалдзе. Праз тры месяцы ён быў у Варонскім сельсовеце. На гэты раз ён адабраў у той-жа гр. Шавалды карову за недоімку па культзбору ў 141 руб. Тут-жа Русанаў прадаў карову ў калгас за 325 р., але розніцу Шавалдзе зноў такі не вярнуў.

Прыпёрты да сцяны гэтымі фактамі і ягчэ радам фактаў, Русанаў прымушан прызнаць, што яго дзеянні былі сапраўды беззаконнымі і злачыннымі. «Аналізуючы зараз гэты эпізод, — заявіў Русанаў, — я сам прыходжу ў жах ад гэтых агіднасцей і праізволу».

Гэта цяпер, калі няма кулы дзяваццца, няма чым апраўдацца, а тады Русанаў зусім не прыходзіў у жах, а, наадварот, прыходзіў у захапленне ад заўзятай антысовецкай па сутнасці дзейнасці Гайсёнкаў і яму падобных. Не выпадкова-ж Гайсёнак быў прадстаўлен Русанавым да прэміравання, як... «ударнік фінансавага фронта». З ноткай жалю гэты «ўдарнік фінансавага фронта» расказвае цяпер суду, што прэмію так і не пасцеў атрымаць, бо перашкодзіў арышт.

Многа скарг атрымаў райфінаддзел ад калгаснікаў і аднаасобнікаў. Скардзіліся на няправільнае налічэнне падаткаў, на паўторныя налічэнні, на адвольныя штрафы, на вопісы і адабранне маемасці і т. д. Але Русанаў адмахваўся ад гэтых скарг, як ад назойлівых мух. Скаргі ў райфа нават не ўлічваліся. Яны або зусім гублялісь ў нетрах канцылярыі, або ляжалі пад спудам безрэзультатна. Уладалюбівы і самаўпэўнены Русанаў лічыў законам толькі свае ўласныя распараджэнні, клапаціўся толькі аб сваім уласным добрабыце, на ўсё астатняе яму было напляваць. У Папэнгеля, Семашкі ён сустракаў спачуванне і падтрыманне. Больш нічога яму не было патрэбна. Няважна, што па закону сельсоветы не маюць права штрафаваць больш, чым на 10 руб.; няважна, што па закону паміж вопісам і адабраннем маемасці паклазцен мінімальны тэрмін у 10 дзён, з тым, каб лаўжнік мог заплаціць належачыя з яго грошы. Русанаў менш за ўсё клапаціўся аб захаванні гэтых законаў. Яго ніколькі не турбавала, што ў сельсоветах накладаюцца штрафы па 100 і больш рублёў, што адразу за вопісам маемасці апошняя тут-жа ізымаецца і прадаецца. Абы толькі маўчаў райком і райвыканком, абы толькі каб не чапалі яго — Русанава.

Пасля Русанава па халайніцтву пракурора дапрашваюцца ў якасці сведак старшыня Заможскага сельсовета Хацько, загалчык акрфінаддзела Новікаў, старшыня Пышнянскага сельсовета Шатыронак. Паказанні сведак дапаўняюць мрачную карціну абурэючага беззаконня і злоўжыванняў, якія рабіліся ў сельсоветах па прамому загаду кіраўнікоў раёна. Сведка Хацько паведамляе суду, што Русанаў яму асабіста гаварыў: «Апішыце маемасць, адбярыце, а потым пасылайце нам на зацвярджанне». Гэта была ўстаноўка, якую Русанаў даваў усім старшыням сельсоветаў.

У раёне панавала атмасфера жаўмуу самакрытыкі, адміністраванне па ўсіх участках. Хацько з'яўляецца старшынёй сельсовета з чэрвеня 1936 г. Не безынтарэсна, як ён аказаўся старшынёй сельсовета.

Пракурор: Калі вас абралі старшынёй сельсовета?

Хацько: Мяне не абралі. У сельсовет прыехаў Семашка і сказаў мне, што я «абран» старшынёй сельсовета. Я тады не быў нават членам сельсовета. Толькі праз тыдзень маё «абранне» афармілі на пленуме сельсовета.

Так парушалася ў раёне дэмакратыя. Так Семашка, Папэнгель і К° назначалі людзей, не запытваючы ў мас, ставілі тых, якія ім былі патрэбны і выгадны.

***

На вячэрнім пасяджэнні былі дапытаны падсудныя Юшкевіч, Семашка і Папэнгель. Семашка і Папэнгель — вось тая загінўшая верхавінка, ад якой выходзілі абурэючыя дырэктывы аб правядзенні масавых вобыскаў, штрафаў, адабрання маёмасці ў калгаснікаў і аднаасобнікаў. На судзе ягчэ больш высвятляецца, што іменна адсюль цягнуліся ніці да злачынлівага скажэння палітыкі партыі і ўрада, да парушэння рэвалюцыйнай законнасці.

Адарваўшыся ад мас, арабіўшы асноўным сваім метадам голае адміністраванне і рэпрэсіі ў адносінах да падоімшчыкаў, Семашка і Папэнгель патрабавалі ад старшынь сельсоветаў цвёрдага правядзення ў жыццё гэтай шкоднай сваёй установкі.

Яны не маглі не ведаць, што творацца злачынства і каму яны граюць на-руку. Яны свядома гралі двайную ігру і подла двурушнічалі. На сходах і ў гутарках аб Сталінскай Канстытуцыі яны праслаўлялі гэты выдатны дакумент, гаварылі аб непахіснасці яго і аб вялікіх правах совецкіх грамадзян, а пасля схода самі давалі ўказанні аб парушэнні Канстытуцыі, аб бесперамонным попранні правоў совецкіх грамадзян.

Яны прызнаюць сябе вінаўнымі. Ды і смешна было-б не прызнаць сябе вінаўнымі перад цяжарам шматлікіх і пераканальных улік. Але і Папэнгель, і Семашка, так дружна і аднадушна даваўшыя сельсоветам злачынныя дырэктывы, цяпер імкнуцца зваліць віну адзін на другога. Найбольш шчыра дае паказанні Юшкевіч. Але і ён імкнуўся ўтоіць свой асабісты ўдзел у адабранні маёмасці ў некаторых падоімшчыкаў — факт, устаноўлены з прадзельнай яснасцю. Падрабязна аб допыце Юшкевіча, Семашка і Папэнгеля заўтра.

С. ГАЛКІН.

КІН В. К.

Кіраўнік Усебеларускай канторы Сельгасбанка.

ФІНАНСАВАЯ ГАСПАДАРКА І ЎЧОТ У КАЛГАСАХ

Рост грамадскіх фондаў калгасаў патрабуе вялікай арганізацыйнай работы і кантролю не толькі праўленняў, рэвізійных камісій калгасаў і саміх калгаснікаў, але і кіруючых арганізацый кожнага раёна. Укладаючы буйнейшыя сродкі ў капітальнае будаўніцтва, ні адзін калгас не павінен парушаць патрабаванняў сталінскага статута сельгасарцелі аб спалучэнні грамадскіх і асабістых інтарэсаў калгаснікаў.

Згодна статута, калгас можа затрачваць на пакупку жывёлы, сельгасмашыны, на будаўніцтва, абсталяванне і т. д. толькі накапленне недзялімых фондаў і крэдыт Сельгасбанка. Астатняя частка даходу, пасля выканання абавязацельстваў перад дзяржавай і пасля пакрыцця вытворчых і адміністрацыйных расходаў, належыць размеркаванню па працаднях.

Аднак, ягчэ многія калгасы ўкладаюць у капітальныя затраты многа больш сродкаў, чым маюць права і гэтым самым змяншаюць сродкі, якія падлягаюць размеркаванню па працаднях. І наадварот, многія калгасы выкарыстоўваюць не на капітальныя ўкладанні частку маючыхся для гэтага сродкаў і гэтым самым марудней пашыраюць аграмаладзяную частку гаспадаркі, чым павінны гэта рабіць згодна статута.

У сувязі з гэтым навядзенне парадку ў фінансавай гаспадарцы калгасаў, упарадкаванне ўчоту, падбор і падрыхтоўка калгасных рахункаводаў набывае выключна вялікае значэнне.

Асноўным арганізуючым фінансавую гаспадарку ў калгасе дакументам з'яўляецца прыхода-расходны кашторыс. Ён заклікан арганізаваць фінансавую гаспадарку, укараніць фінансавую дысцыпліну, стварыць адказнасць праўлення калгаса за планавае і эканомнае выдаткаванне калгасных грошай.

У сталінскім статуце сельгасарцелі запісана: «Усе даходныя паступленні абавязкова запісваюцца ў прыход арцелі не пазней дня іх паступлення. Як на даходныя паступленні, так і на выдаткаванне сродкаў праўленнем арцелі складаецца гадавы кашторыс, які ўступае ў сілу толькі пасля зацвярджэння агульным сходам арцелі. Выдаткаванне сродкаў праўленне можа праводзіць толькі па тых артыкулах, якія прадугледжаны кашторысам, — самавольная перасоўка сродкаў з артыкула ў артыкул расходнага кашторыса праўленнем не дапускаецца і для перасоўкі сродкаў з артыкула ў артыкул праўленне абавязана запытаць дазволу агульнага схода».

У 1936 годзе прыходна-расходныя кашторысы былі складзены ў 8.450 калгасах з 9628 існуючых. Якасць кашторысаў у большасці калгасаў астаецца вельмі нізкай. Гэта тлумачыцца адсутнасцю аправеднага штодзённага кіраўніцтва гэтай справай з боку органаў Наркамзема, частымі зменнямі вытворчых заданняў у сярэдзіне года, нізкай кваліфікацыяй рахункаводаў калгасаў і самае галоўнае — недаацэнкай гэтага важнейшага дакумента старшынямі калгасаў.

Сістэма Сельгасбанка ў БССР сваю работу па выкананню дырэктыў урада ў справе наладжвання фінансавай гаспадаркі і ўчоту ў калгасах праводзіла шляхам аналізаў гадавых і квартальных справаздач і дачы па іх рэкламацый, жывой дапамогі пры выездах у калгасы інспектароў банка, сістэматычнай зверкі банкаўскіх запісаў па аперацыях калгаса з запісамі ў самім калгасе, у аказанні дапамогі па ліквідацыі дэбіторскай запазычанасці і т. д. Так, напрыклад, за першы квартал 1936 года сістэмай Сельгасбанка было прааналізавана 1487 квартальных фінансавых справаздач калгасаў, за другі квартал 1932 і за трэці квартал 1873.

У 1936 годзе 41 аддзяленне і інспектарскія групы, якія абслугоўваюць 4879 калгасаў, прааналізавалі 3452 гадавыя справаздачы за 1935 год, або 70,7 проц.

Праверка паказала, што прыхода-расходныя кашторысы ў вялікай колькасці калгасаў парушаліся. Змены расходаў не станіліся на абмеркаванне і зацвярджэнне агульных сходаў калгасаў. Так, па Менскаму раёну 23 калгасы парушылі статут сельгасарцелі, накіраваўшы на капітальныя затраты больш сродкаў, чым у іх мелася непадзельных фондаў на 109,6 т. руб.

У гадавых справаздачах гэтых калгасаў указаныя парушэнні маскаваліся пад назвай «мэтавыя ўзносы» калгаснікаў. Праведзенай на мясцах канторай Сельгасбанка праверкай устаноўлена, што ніякіх пастаноў агульных сходаў калгаснікаў аб мэтавых узносах на капітальныя затраты не было. У мэтах скрыцця перарасходу на капітальныя затраты праўленні калгасаў адносілі іх на мэтавыя ўзносы, змяншаючы гэтым самым кошт працадня.

Перарасходы на капітальныя ўкладанні тлумачацца тым, што часта праўленні калгасаў без уліку сумы сродкаў, якія могуць быць накіраваны на капітальныя затраты, разгортваюць велізарныя будаўніцтвы, не беручы дазволу агульнага схода арцелі. У разультаце зробленыя расходы на будаўніцтву і іншых відах капітальных затрат не пакрываюцца максімальна дапускаемым статутам — 20 проц. адлічэнняў у непадзельныя фонды. Праўленне калгаса ў падобных выпадках пакрывае гэтыя перарасходы за кошт сродкаў, прызначаных для размеркавання па працаднях, чым парушаецца абавязковая ўмова — правільнага спалучэння грамадскіх інтарэсаў калгасаў з асабістымі інтарэсамі калгаснікаў.

Няма сумнення, што трацкісты, нацдэмы і правыя адшчапенцы і тут прыкладваюць свае паганыя рукі. Гэтыя ворагі народу ўсяляк стараюцца зменшыць кошт працадня для таго, каб выклікаць незадавальненне калгаснікаў.

У БССР мы маем велізарныя магчымасці павялічыць кошт працадня калгасніка праз цэлы рад крыніц, якія даюць дадатковыя даходы. Напрыклад, развіццё падсобных калгасных прадпрыемстваў: цагельна-чарапічныя заводы, пабудаваныя па мясцовай сыравіне, выраб прадметаў з дрэва, лазы і т. д.

Аднак, максімальнае выкарыстоўванне ўжо выяўленых даходных крыніц і выяўленне новых пастаўлена ў нас незадавальняюча. Дастаткова сказаць, што такое выключна важнае мерапрыемства, як пабудова пагельных і чарапічных заводаў, якія маюць значэнне як у справе атрымання дадатковых даходаў калгасаў, так і ў справе дабрабыту сацыялістычнай калгаснай вёскі, арганізавана дрэнна. План у 1936 годзе па пабудове 1.000 цагельных і чарапічных заводаў не выкананы. Пабудавана толькі 229 заводаў. Адпушчаны на гэта дзяржаўны крэдыт у значнай суме астаўся не выкарыстаным. З перадачай кіраўніцтва гэтай справай з Наркаммясцпрома Наркамзему становішча не палепшылася. У такім-жа становішчы знаходзіцца і млынарная гаспадарка калгасаў.

Выяўленыя факты парушэння сталінскага статута і калгаснай дэмакратыі, незадавальняючае становішча ўчоту ў калгасах — з усёй вастрынёй ставіць пытанне аб узмацненні кіраўніцтва фінансавай гаспадаркай калгаса з боку перш за ўсё органаў Наркамзема, узмацнення дапамогі ў гэтай справе з боку фінансава-крэдытных устаноў і, у першую чаргу, з боку работнікаў сістэмы Сельгасбанка. Гэтыя факты патрабуюць пашырэння мерапрыемстваў па ўзвышшю кваліфікацыі калгасных рахункаводаў, укамплектавання райза і МТС кваліфікаванымі бухгалтарамі-інструктарамі, якія могуць забяспечыць высокакласны кансультацыйны пункт калгаснага рахункавода ў яго штодзённай рабоце, так і рэвізійныя камісіі калгасаў.

Дапамога ў наладжванні фінансавай гаспадаркі калгасаў з боку сістэмы Сельгасбанка ў 1937 годзе павінна быць разгорнута ягчэ шырэй і якасна палепшана.

Праведзеная віцебскім аддзяленнем Сельгасбанка работа паказала, як значны ягчэ дэфекты ў калгаснай справаздачнасці і ў 1937 годзе. Так, у часці рахунковай праверкі няправільныя астаткі па рахунках непадзельных фондаў паказалі ў сваіх гадавых справаздачах 11 калгасаў, няверныя сумы атрыманых крэдытаў 18 калгасаў, няправільна паказалі звернутыя банку крэдыты і заплочаныя пропанты 39 калгасаў. Выяўлены парушэнні статута сельгасарцелі ў частцы адлічэння ў непадзельныя фонды менш 10 проц. у 6 калгасах, больш 20 — па 5 калгасах. Выдаткавана на адміністрацыйна-гаспадарчыя выдаткі больш 2 проц. па 25 калгасах. Выяўлен астатак невыкарыстаных непадзельных фондаў у памерах 64.149 руб., з якіх 31.212 руб. накіраваны ў абаротныя сродкі.

Вывучэнне фінансавай гаспадаркі калгаса з боку філіялаў Сельгасбанка ёсць неабходная ўмова для правільных крэдытных адносін з калгасамі. Дабіцца ўзорнай пастаноўкі фінансавай гаспадаркі ў калгасах, як важнейшай часткі мерапрыемстваў па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў.

ГНУСНЫЯ ЗДЗЕКІ НАД СТАХАНАЎКАЙ ВІНАКУРАВАЙ

У мінулым годзе знатная ў Кіраўскім раёне стахана́ўка—звеннявая Вінакурава Надзя, зварачаючыся з першай усебеларускай нарады перадавікоў ураджайнасці, была поўных надзей сваёй далейшай плённай работы. Раённыя арганізацыі, як гэта бывае ў такіх выпадках, наладзілі ёй сустрэчу, выносілі шмат пажаданняў, абяцалі дапамагаць у рабоце.

Калі Вінакурава Надзя прыехала ў свой калгас «17 партз'езд», яна адчула зусім іншае. Вінакурава ўбачыла варожы ёй настрой некаторых калгаснікаў, падкаваных супроць яе Шмыгуном, выключаным з партыі, як варожы элемент.

На агульным калгасным сходзе, дзе Вінакурава дзялілася ўражаннямі нарады, яе абсмейвалі, ганьбілі. Вінакурава вымушана была пакінуць сход.

У часе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы здзекі яшчэ больш узмацняюцца. Былы старшыня калгаса Шмыгун, запрасіўшы Вінакураву ў сваю хату, імкнуўся згвалціць яе. Вінакурава падае аб гэтым заяву ў раённую міліцыю. Заява без рэагавання прапала нецэ.

Пазней Вінакурава атрымлівае пісьмо ад сельгасаддзела ЦК КП(б)Б з просьбай расказаць пра вопыт сваёй работы. У гэтымжа канверце на абароце пісьма Вінакурава знаходзіць гнусны подпіс, які ганьбуе яе.

Вінакурава гэта пісьмо з заявай падае ў міліцыю, адначасова заяўляе старшыні свайго Паўлавіцкага сельсовета т. Гарлачову. Як міліцыя, так і сельсавет не рэагуюць на заяву. Яна заяўляе ў райком КП(б)Б, дзе таксама не звярнулі на гэта ніякай увагі.

Рыхтуючыся да раённай сельскагаспадарчай выстаўкі, Вінакурава Надзя адбірае экспанаты з атрыманага высокага ўраджаю бульбы — 355 цэнтнераў з гектара, зярна — 24 цэнтнеры, ільнавалакна — 7,8 цэнтнера з гектара. Па дарозе па выстаўку група калгаснікаў на чале з былымі белагвардзейцамі Лёгкім Андрэем, Назарчыкам Змітром адбіраюць у Вінакуравай экспанаты і збіваюць яе. Вінакурава аб гэтым заявіла раённаму пракурору Царыку з просьбай расследаваць і судзіць вінаўных. Аднак, заява астаецца і па сёнешні дзень ляжаць без руху.

На раённым з'ездзе Саветаў Вінакураву абіраюць делегаткай на Надзвычайны XII Усебеларускі З'езд Саветаў. Яна вярнулася са З'езда і здзекі яшчэ больш узмацніліся. Шофер легкавой машыны РК КП(б)Б Чыжонак, які вёз яе дадому, па дарозе ссадзіў, матывуючы недахопам бензіну. Вінакурава ішла 6 кіламетраў па грязі. Прыйшоўшы дадому, з яе пачалі смяяцца, што быццам-бы Вінакураву прагналі са з'езда і што яна 8 дзён ішла пехатой з Менска. Дайшло да таго, што ёй, як мужу і дзецям у калгасе не даюць праходу.

Вінакурава зварачаецца ў сельсавет, а пазней у РВК з просьбай дапамагчы склікаць агульны сход калгаснікаў, бо старшыня калгаса Лёгкі А. адмаўляецца. На сходзе Вінакурава хацела зрабіць справаздачу аб рабоце З'езда Саветаў. У РВК абяцалі прыехаць у калгас і дапамагчы склікаць сход калгаснікаў, але так і не прыехаў ніхто.

У канцы снежня Кіраўскі РВК праз Паўлавіцкі сельсавет паслаў Вінакуравай пупёўку ў дом адпачынку. Аднак, гэтай пупёўкі яна не атрымала і па сёнешні дзень. Член сельсавета Макаронак трымаў пупёўку больш двух тыдняў. У выніку тэрмін сапраўднасці пупёўкі сышоў.

Яшчэ ў лістападзе мінулага года Кіраўскі райком КП(б)Б выключыў з радоў партыі за ўтойванне мінулай дзейнасці белагвардзейца Лёгкага — старшыню калгаса імя 17 парта'езда. Адначасова райком партыі пастанавіў паставіць перад агульным сходам калгаснікаў пытанне аб знятці Лёгкага з пасады старшыні калгаса, а рэкамендаваць калгаснаму сходу старшынёй Вінакураву Надзю. Правесці выбары было даручана члену РК, старшыні РВК Касцюку.

Што-ж робіць Касцюк? Пасля доўгіх збіранняў выехаць у калгас Касцюк парашыў не выязджаць, а даручыў гэта зрабіць старшыні Паўлавіцкага сельсовета Гарлачову. Апошні таксама збіраўся больш двух тыдняў выехаць у калгас і ніяк не сабраўся, перадаручыўшы правесці выбары старшыні калгаса паўлавіцкай комсамольскай пярвічнай арганізацыі. Комсамольская арганізацыя даручыла 17-гадоваму комсамольцу Сергейчуку, які толькі 31 снежня склікаў агульны сход калгаса.

На гэтым сходзе комсамолец Сергейчук паведаміў: «па рашэнню райкома партыі, Лёгкі Андрэй знят са старшыні калгаса, а на яго месца назначаецца Вінакурава Надзя».

Выбары Вінакуравай адбыліся з вялікай насмешкай над ёю з боку прыхільнікаў Лёгкага.

Аб фактах бяздушных адносін, гнусных здзекаў над лепшай стахана́ўкай Вінакуравай не раз пісала раённая газета, але раённыя арганізацыі не рэагавалі на сігналы друку, бяздушна аднесліся да лепшай стахана́ўкі раёна.

Сучаснае становішча ў калгасе «17 парта'езд» добра вядома і ў райкоме партыі і ў райвыканкоме. Добра вядома кіраўнікам раёна, што ворагі народу ўсіляк імкнуцца зганьбіць работу стахана́ўкі Вінакуравай, імкнуцца разбурыць калгас. Аднак ні райком партыі, ні райвыканком не прымаюць ніякіх мер.

М. ЯРЧАК.

Манцёр-слесар соўгаса «Орэшкава» (Лухавіцкага раёна, Маскоўскай вобласці) В. М. Катомкін здаў дзяржаўны тэхнічны экзамен на выдатна. Цяпер ён загадвае трактарнай майстэрняй соўгаса. Тав. Катомкін вядзе рэгулярныя заняткі з вучнямі-слесарамі, падрыхтоўваючы з іх кваліфікаваных работнікаў соўгаса. На здымку: тав. Катомкін знаёміць лепшага свайго вучня Сашу Казлова з новымі дасягненнямі ў трактарнай справе.

Фото П. Волкава (СФ).

Праф. Ю. ІРГЕР і доктар І. СТЭЛЬМАШОНАК

ПЕРАЛІВАННЕ КРЫВІ

Ахова здароўя працоўных нашай социялістычнай радзімы з кожным годам узбагачаецца новымі магутнымі сродкамі, адным з якіх з'яўляецца пераліванне крыві.

У БССР гэтай важнейшай справай на працягу 5 год займаецца спецыяльны інстытут гематалогіі і пераліванння крыві.

У задачы інстытута ўваходзіла ўсебаковае асваенне метада пераліванння крыві, укараненне яго ва ўсе лячэбныя ўстановы БССР і арганізацыя пастаянных кадраў донараў (людзей, якія даюць сваю кроў для пераліванння).

Надзвычай важна было арганізаваць пераліванне не толькі свежай, але і кансерваванай крыві, якая можа захоўвацца і транспартавацца на далёкія адлегласці.

Наколькі метад прыналежнасці крыві стаў папулярным сярод працоўных і медыцынскіх работнікаў сведчаць некалькі наступных лічб.

У 1931 годзе па БССР было зроблена 7 пераліванняў, а ў 1936 г.—1447 пераліванняў крыві. За 5 год беларускім інстытутам і яго філіялямі зроблена 4029 пераліванняў крыві, у тым ліку кансерваванай 1618 (40 проц.).

У інстытуце і некаторых яго філіялах заўсёды ёсць гатовая кансерваваная кроў, якая ў экстраных выпадках неадкладна дастаўляецца на самалёце, аўтамашыне і па чыгунцы.

Інстытут і яго філіялы навучылі пераважную большасць урачоў БССР тэхніцы вызначэння груп крыві. Большасць урачоў хірургічных і акушорскіх аддзяленняў больніц БССР падрыхтаваны для арганізацыі пераліванння крыві.

Беларускім інстытутам пераліванння крыві распрацоўваліся навуковыя праблемы кансервавання крыві, прыгатавання і вывучэння стандартных сываратак, групавой прыналежнасці крыві і пераліванне крыві, як лячэбны метад. Па ўсіх гэтых пытаннях напісана 60 работ, якія надрукаваны ў перыядычных выданнях саюза і ў спецыяльным зборніку, выданым інстытутам. Работа «аб уплыве тэмпературы на кансерваваную кроў» надрукавана ў матэрыялах сусветнага кангрэса па пытаннях пераліванння крыві.

11 сакавіка ў Менску адкрываецца другая навуковая канферэнцыя беларускага інстытута гематалогіі і пераліванння крыві, прысвечаная пяцігоддзю арганізацыі справы пераліванння крыві ў БССР.

Канферэнцыя павінна падвергнуць рэзкай крытыцы недахопы работы як самога інстытута, так і яго філіялаў. Некаторыя з іх яшчэ працуюць дрэнна (магілеўскі і аршанскі філіялы).

Мы маем усе ўмовы для таго, каб значна шырэй паставіць пытанне пераліванння крыві, асабліва ў галіне падрыхтоўкі кадраў і вярбоўкі донараў. Кожны ўрач павінен авалодаць тэхнікай вызначэння групавой прыналежнасці крыві і методыкай яе пераліванння.

На канферэнцыі будуць заслуханы 30 дакладаў. Вялікая ўвага будзе аддана значэнню і эфекцыўнасці пераліванння крыві пры розных захворваннях (вострых і хранічных крывяцячэннях, язве страўніка, гемафіліі, самаўтаральнай гангрэне, пасляродавых захворваннях і інш.).

Спецыяльныя даклады будуць прысвечаны пытанням пераліванння іншагрупнай, плацэнтарнай і жывёльнай крыві чалавеку, а таксама праблеме кансервавання крыві, якой інстытут займаецца на працягу некалькіх год. 5 дакладаў будзе прысвечана барацьбе з малярыяй.

На канферэнцыю запрошаны буйнейшыя вучоныя з розных гарадоў Саюза ССР, а таксама ўрачы з розных пунктаў БССР. У канферэнцыі прымуць удзел заслужаны дзеяч навукі прафесар С. І. Спасакукоцкі і дырэктар цэнтральнага інстытута пераліванння крыві ў Маскве дацэнт А. А. Багдасараў.

Бліжэйшая наша задача дабіцца такога становішча, каб ва ўсякі момант і ва ўсякім пункце можна было арганізаваць пераліванне крыві, якое мае велізарнае значэнне не толькі ў мірны час, але непараўнальна большае ў ваенны час, калі краіна павінна будзе даць узброены адпор міжнароднаму фашызму, падпальшчыку новай сусветнай вайны.

ЗАСМЕЧАНАСЦЬ СІРОЦІНСКАГА РАЙВЫКАНКОМА

Сіроцінскі раён з года ў год адстае па ўсіх правадзімых гаспадарча-палітычных работах. Асабліва трывожна абстаіць справа з развіццём социялістычнай жывёлагалоўлі, у прыватнасці коней. За адзін толькі 1936 год пала звыш 800 коней, з іх палова прыпадае на кабыліц. Гэта ёсць прамы рэзультат класава-варожых дзеянняў, накіраваных на развал калгасаў, на зрыў усіх мерапрыемстваў, правадзімых партыяй і совецкім урадам.

На працягу доўгага часу совецкае кіраўніцтва ў раёне ўзначальвалі контрраволюцыйныя трацкісты (Цофін), аферысты, чужакі і разлажыўшыяся элементы накшталт Барсукевіча, Кабыша і Балшна.

Гэтыя трацкісты выключаны з партыі, выгнаны з раёна. Але яны пакінулі пасля сябе агентуру, як у апараце райвыканкома і яго аддзелаў, так і ў сельскіх советах.

Так, старшым аграномам райза працуе Васілеўскі — сын кулака, друг, прыяцель і сабутыльнік вядомага нацдэма Масюкова. Разам з ім Васілеўскі ў свой час дасаджаў у Сіроцінскім раёне хутары.

Разам з «вылучэнцам» чужака Кабыша (б. старшыня райвыканкома), загадчыкам райза Шчарбаковым Васілеўскі склалаў яўна шкодніцкія планы сяўбы. Райком партыі не запвердзіў гэта шкодніцкае планіраванне, але вывадаў для сябе не зрабіў. Васілеўскі па-ранейшаму працягвае працаваць.

Загадчык райза Шчарбакоў гэтага нацдэма Васілеўскага, дзе толькі можа, бярэ пад сваю асабістую абарону. Гэта невыпадкова. Шчарбакоў звязан з групай варожых совецкай уладзе людзей, разам з імі праводзіць палітыку развалу калгасаў.

Чаго варта такая практыка, калі ўручэнне актаў калгасам на вечнае карыстанне зямлёй ён выкарыстаў не для арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання калгасаў, а па сутнасці для значнага паслаблення іх гаспадарчай магутнасці. Па яго непасрэдных указаннях праўленні калгасаў растрачвалі калгасныя сродкі на розныя банкеты, у сувязі быццам-бы з уручэннем актаў на вечнае карыстанне зямлёй. Так, для гэтых банкетаў выдаткавана 100 тысяч рублёў калгасных сродкаў, не лічачы, што апрача гэтага знішчаецца незаконна калгасная жывёла і іншыя прадукты.

Толькі ў адным калгасе «Чырвоная Лоўша» выдаткавана на гэта мерапрыемства 3 тысячы рублёў. Вось вытрымка з пастановы аднаго праўлення калгаса: «Для сустрэчы раённых работнікаў і на частаванне іх зарэзаць барана на мяса і адпусціць 150 руб. на гарэлку».

Не менш яркай фігурай з'яўляецца фігура загадчыка райфа Розеншталь. Гэта чалавек, які яшчэ і да гэтага часу носіць партыйны білет у кішэні, з'яўляецца лютым ворагам. У мінулым ён меў суровую вымову за выступленне супроць індустрыялізацыі краіны. Ён актыўна падтрымліваў платформу правых рэстаўратараў капіталізма.

Раскаяўшыся, прыкінуўшыся агнцам, ён і зараз працягвае праводзіць антысовецкую практыку. Ён яўна скажае фінансавую палітыку совецкай улады, ён праводзіць няправільную палітыку штрафавання і адабрання маемасці.

Ён разам з Шчарбаковым, Юдзіцкім (былы эсэр, выключаны з радоў партыі) праводзіць контрраволюцыйную агітацыю, займаецца траўляй чесных, адданых людзей.

Гэтыя людзі ўзначальвалі шкодніцкую работу, якая праводзілася ў радзе калгасаў. Вось асобныя факты:

У калгасе «Ленінскі прамень» у 1935 годзе ў рэзультаце падпалу згаралі 9 жаробных конематак, 8 коней пала. У 1936 годзе пала 11 коней і абартавала 7 конематак. Племяннога 3-гадовага жарабца знайшлі задушаным у станку. Лепшай калгаснай кабылцы былі нанесены смяротныя раненні. Гэтым аднак не абмяжоўваюцца дзеянні ворагаў. У лістападзе мінулага года былі атраўлены мыш'яком 15 свіней.

У калгасе «Перамога» ў 1935 г. кулацкай сям'ёй Прыгожыных быў падпалены калгасны скотнік. Згарэлі 27 цялят ва ўзросце аднаго года. У лістападзе ўзнік пажар у калгаснай пуні, які паспелі патушыць. А праз месяц пуня была зноў кімсьці падпалена, згарала звыш 150 цэнтнераў аўса. Віноўныя ў падпале на сёнешні дзень так і не знойдзены. Да рэчы, «ахоўвае» пуню выключаны з калгаса за зладзейства некі Гнедонскі. Яму і было даручана старшынёй калгаса, членам партыі Белюсевым ахоўваць калгаснае дабро. Раённы камітэт партыі нават не палічыў патрэбным абмеркаваць гэты паступак Белюсева, у рэзультаце якога калгасу была нанесена вялікая страта.

У калгасе «Ленінскі прызыў» у 1936 г. у рэзультаце варварскіх адносін да коней пала 14 коней ва ўзросце ад 7 да 10 год. Бюро райкома партыі на сваім пасяджэнні ад 23 студзеня 1937 г. даручыла старшыні калгаса, кандыдату партыі Мясаедаву і старшыні Мішковіцкага сельсовета Аксельроду вылавіць канкрэтных вінаўных у падпяжы коней. Аднак і па сёнешні дзень гэтыя людзі яшчэ нічога не зрабілі. Аб вынесеным сваім рашэнні райком партыі так і забыўся.

Доўгі час на вачах у раённых арганізацый калгасам «Гвардыя Леніна» кіраваў жулік, растратчык і беспрабудны п'яніца Бужынскі. Гэты яўны вораг совецкай улады займаўся сістэматычным спайваннем калгаснікаў.

Толькі нядаўна Бужынскага калгаснікі знялі з работы старшыні калгаса і зараз ён прыцягваецца да суловай адказнасці. Загадчык-жа райза Шчарбакоў неадпаразова бываў у калгасе «Гвардыя Леніна» добра ведаў усе жульніцкія прадзелкі Бужынскага, але наўмысля іх скрываў.

Былы старшыня райвыканкома Кабыш разам з Шчарбаковым выжылі з райза агранома-комуніста тав. Бабіча, паставілі на яго месца вышэйпамянутага нацдэма Васілеўскага.

Да ўсяго гэтага трэба дадаць нізкі ўзровень унутрыпартыйнай і партыйна-масавай работы, што яшчэ больш аслабляе большэвіцкую раволюцыйную пільнасць і садзейнічае ворагам у іх контрраволюцыйнай шкодніцкай рабоце. Голае адміністраванне — замест масавай работы, ігнараванне сталінскага статута сельгасарцелі і Сталінскай Канстытуцыі — досыць масавае з'явішча ў Сіроцінскім раёне.

Ачысціць апарат райвыканкома і кіраўніцтва калгасаў ад усіх шкоднікаў, жулікаў, стаўленікаў трацкіста Цофіна і яму падобных — неадкладная задача партыйнага і совецкага кіраўніцтва Сіроцінскага раёна.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.

Лабараторыя новых сельскагаспадарчых машын

Беларуская станцыя механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі падводзіць вынікі сваёй 4-гадовай дзейнасці. Рыхтуецца выстаўка сельскагаспадарчых машын, сканструяваных работнікамі станцыі і калгаснікамі-вынаходнікамі БССР.

За 4 гады станцыяй распрацаваны 30 канструкцый розных сельскагаспадарчых машын. Многія з іх добра працуюць на палях калгасаў і соўгасаў СССР і выпускаюцца заводамі сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва масавымі серыямі. За адзін толькі 1936 год заводы выпусцілі 2500 бульбаўборачных машын, 200 наземных дарог, 14 капавакапальнікаў, 100 балотных плугоў, 500 бульбасартыровак, 250 корнерэзак і іншых машын, сканструяваных калектывам Беларускай станцыі. У 1937 годзе вытворчасць гэтых машын значна павялічыцца.

Да апошніх работ станцыі адносяцца двухрадны бульбакамбайн — тав. Мацэпура, 12-корпусны плуг да трактара «ЧТЗ» — т. САМКО, новы кормазапарнік, які па сваёй прастаце можа вырабляцца ў кожным калгасе. Распрацоўваецца машына для ўборкі новай у Беларусі культуры — канатніка.

Праводзіцца таксама работа па падрыхтоўцы кадраў механізатараў сельскай гаспадаркі. На арганізаваных пры станцыі курсах падрыхтаваны 400 камбайнёраў, механікаў, трактарыстаў, загадчыкаў нафтавай гаспадаркі МТС. Цяпер на курсах камбайнераў навучаецца 100 жанчын.

Асноўны склад работнікаў станцыі — гэта маладыя спецыялісты-беларусы, скончыўшыя совецкія навучальныя ўстановы. Сярод іх выдзяляюцца здольныя вынаходнікі, як тт. Мацэпура, Мазурко, Самко, Дэканенка і інш.

Станцыя служыць месцам масавых экскурсій калгаснікаў, студэнтаў сельскагаспадарчых навучальных устаноў, зямельных работнікаў, тэхнікаў сельскай гаспадаркі, дзе яны знаёмяцца з машынамі, іх асваеннем і атрымліваюць кансультацыю.

М. КІН.

ПАБУДОВАН ЗАВОД ІЗАЛЯЦЫЙНЫХ ПЛІТ

У Гомель прыбыла камісія Наркамлеса СССР для прыёмкі новага новабелицкага завода ізаляцыйных пліт, пабудаванага ўпершыню ў Саюзе. Магутнасць завода разлічана на выпуск 4.200 тон драўнасвалакнистых пліт розных гатункаў — цвёрдых, поўцвёрдых і порыстых у год. Гэтыя пліты па сваёй гуканепранікальнасці, цеплаёмкасці могуць быць ужыты ў будаўніцтве, пры аддзелцы памяшканняў і т. д. Цяпер ізае работа над тым, каб зрабіць іх водапенранікальнымі. Сыравінай для завода служаць шчэпа-адыходы побач размешчанага каніфольнага завода. Адыходы раней выкідваліся ў возера. Завод забяспечан навейшай тэхнікай. Усе працэсы вытворчасці механізаваны. Кошт яго каля 4 мільёнаў рублёў. Завод знаходзіцца ў сталькі асваення.

АЧАГІ ВАЙНЫ

САПРАЎДНАЯ СУТНАСЦЬ ЯПОНА-ГЕРМАНСКАГА ПАГАДНЕННЯ

Дзяржаўнае социяльна-эканамічнае выдавецтва выпусціла пад рэдакцыяй інстытута сусветнай гаспадаркі і сусветнай палітыкі Акадэміі навук кнігу А. Барысава «Япона-германскае пагаднене».

У кнізе дан падрабязны аналіз японагерманскага пагаднення ад 25 лістапада 1936 года. На аснове багатых фактычных матэрыялаў аўтар паказвае, што апублікаваны адначасова ў Берліне (сталіца Германіі) і Токіё (сталіца Японіі) тэкст пагаднення з'яўляецца толькі простай маскіроўкай, знешнім прыкрыццём ваеннага саюза, накіраванага супроць СССР і ўсяго свету, прычым аўтар асабліва падрабязна спыняецца на характарыстыцы ачага вайны па Далёкім Усходзе, на ваенных падрыхтаваннях імперыялістычнай Японіі.

У пачатку кнігі А. Барысаў прыводзіць рад вожукаў сусветнага друку — англійскіх, французскіх, амерыканскіх газет, — аб япона-германскім пагадненні. Сусветны друк з самага пачатку расцаніў гэта пагаднене, як ваенны саюз двух агрэсараў супроць свету. За шырмай пагаднення аб «барацьбе супроць Комінтэрна» і «абмене інфармацыяй» хаваюцца ваенныя планы двух імперыялістычных драпежнікаў.

Германія і Японія так адкрыта і нахабна рыхтуюць грабежніцкую вайну за новы перадзел свету, што нават у капіталістычных краінах добра разумеюць сапраўдны характар япона-германскага пагаднення.

Асабліва цікавы наступны раздзел кнігі аб актыўным удзеле Германіі ў японскіх узбраеннях Ганлёвыя абароты Японіі з Германіяй за апошнія гады значна вырасці.

Круп. Тысэн, І. Г. Фарбеніндустры — буйнейшыя германскія фірмы, сапраўдныя гаспадары фашыскай Германіі — даўно ўжо дапамагаюць Японіі ва ўзбраеннях і ў стварэнні ўласнай ваеннай прамысловасці. Калі ў 1933 годзе ўвоз у Японію з Германіі складаў 25.800 тысяч іен (японская валюта), дык у 1936 г. (з студзеня па лістапад) ён складаў 106.350 тыс. іен.

Германія ўвозіць у Японію хімічныя прэпараты, буйныя токарныя станкі, абсталяванне для алюміневых і хімічных заводаў, абсталяванне для прадпрыемстваў, якія вырабляюць танкі. Разам з тым Германія прымае прамы ўдзел у абсталяванні Манчжурскага ваеннага плацдарма. Германія збіраецца будаваць у Манчжурыі вялікі завод коштам у 12 мільёнаў марак для вытворчасці сінтэтычнага бензіна з вугалю па металу Фішэра.

Германія абавязалася, у абмен на соевыя бабы, паставляць у Манчжурыю ваенныя матэрыялы і машыны для ваенных заводаў.

Буйнейшы германскі трэст І. Г. Фарбеніндустры прадастаўляе японскаму канцэрну Міцубісі права скарыстоўваць свае патэнты па вырабу важнейшых хімічных прадуктаў.

Круп дапамагае Японіі рэканструяваць важнейшыя ваенныя арсеналы і пераабсталёўваць японскія металургічныя заводы, у прыватнасці буйнейшы камбінат Явата. Японская дызельная кампанія будзе заводы па выпуску для армії дызельных грузавікоў, карыстаючыся германскімі патэнтамі.

Аўтар кнігі ярка апісвае ідэалагічную падрыхтоўку германскімі і японскімі імперыялістамі ваеннага саюза абодвух дзяржаў.

Японска-германская дружба абгрунтоўваецца «радством душ», «расавай блізасцю» немцаў і японцаў, «агульнай гістарычнай місіяй», хлуслівымі дэмагагічнымі тэорыямі аб «народах без абшараў», аб «нізмаёмных пацыях», аб «законным праве» захвату чужых тэрыторый і інш.

Германія шырока скарыстоўвае рад таварыстваў і арганізацый, заснаваных у свой час у Японіі, для папулярызацыі фашыскіх ідэй, для прапаганды ваенных захватаў. Гэта — германскае таварыства па вывучэнню прыроды і народаў Усходняй Азіі ў Токіё, японска-германскі інстытут культуры ў Токіё, германскі навукова-даследчы інстытут у Кіото, Усходнеазіяцкая місія, Японска-германская таварыства ў Осака, таварыства Далёкага Усходу і інш. Усе гэтыя таварыствы з'яўляюцца своеасаблівым фашыскім агітпропам, які ўмацоўвае і папулярызуе ідэі японска-германскага саюза і вядзе самую шалёную прапаганду супроць Совецкага Саюза.

У раздзеле «Як яны ўзбройваюцца» аўтар дае падрабязны аналіз узбраенняў абодвух саюзнікаў. Ён прыводзіць вельмі цікавыя лічбы, якія ярка малююць шалёную гонку ўзбраенняў і шырокую падрыхтоўку да «вялікай вайны».

У мінулым годзе Японія прыступіла да выканання 7-гадовага плана матарызацыі армії. Для гэтага асігнавана каля 250 мільёнаў іен. Стварэнне 8 новых стрэлковых дывізій. Гэта будзе азначаць павелічэнне японскай армії больш чым на 50 проц. Праведзена рэарганізацыя японскага ваенна-морскага флота з мэтай узмацнення боездольнасці ваенна-морскіх сіл. План будаўніцтва японскага марскага флота 1937—38 г. прадугледжвае пабудову 1—2 лінкораў, лёгкіх крэйсераў, авіяносцаў, эскадранных мінаносцаў новага тыпу, тарпедных каперaў і падводных лодак. Японія мяркуе мець не менш 90 падводных лодак сучаснага тыпу. Пашыраюцца і ўдасканальваюцца ваенна-морскія базы ў Японскім моры, Татарскім праліве, Жоўтым моры і інш.

У Манчжурыі Японія ў шырокім маштабе рыхтуе ваенны плацдарм. За 5 год акупацыі Манчжурыі пабудавана каля 3.000 кіламетраў чыгуначных ліній. Зараз у стадыі будаўніцтва знаходзіцца звыш 1 тысячы клм. Значная частка ўсіх ліній вядзе да граніц Совецкага Саюза і Манголыскай народнай Рэспублікі. Значна пашырылася сетка аэрадромаў. Зараз іх налічваецца звыш 60.

Усе гэтыя мерапрыемствы па падрыхтоўцы да вайны паглынаюць велізарныя грашовыя сродкі. Калі асігнаванні на армію і флот у 1928—29 годзе раўняліся 28,5 проц. усяго бюджэта, дык у 1936—37 годзе яны дасягнулі 47 проц. Калі-ж ўлічыць усякага чыну тайныя ваенныя асігнаванні па каштарысах грамадзянскіх ведамстваў, дык фактычныя выдаткі на падрыхтоўку вайны перавысяць палову ўсяго бюджэта дзяржавы.

Супроць каго накіравана японска-германскае пагаднене? Гэтаму пытанню прысвячаецца самы вялікі раздзел кнігі. Японска-германскі блок агрэсараў у першую чаргу пагражае Совецкаму Саюзу. І ў планах германскага фашызма, і ў планах японскіх імперыялістаў антысовецкая вайна грае першаступенную ролю.

Ведучы шалёную падрыхтоўку вайны супроць Совецкага Саюза, японскія імперыялісты разглядаюць Манголыскую народную Рэспубліку, як плацдарм для падрыхтоўкі нападу на СССР. Барацьба за манголыскі плацдарм непарыўна звязана з агрэсіўнымі намерамі Японіі ў адносінах Совецкага Саюза. Мала гэтага. Японскія ваенныя публіцысты пішуць, што «цэнтр азіяцкага кантынента ляжыць у Манголіі. Той, хто ўладае цэнтрам азіяцкага матэрыка, той хутка будзе панаваць над самім азіяцкім кантынентам. Стварэнне незалежнай манголыскай дзяржавы паскорыць следаванне Тыбета па японскаму шляху і... тады мы крок за крокам наблізімся да сэрца Велікабрытаніі (чытай — Індыі)». Вось мары японскіх імперыялістаў.

Японскія ваенныя агітатары не шкадуюць сіл, каб дыскрэдытаваць мірную палітыку Совецкага Саюза. Іх бясспадобныя намаганні паказваюць, якой магутнай зброяй міру з'яўляецца знешняя палітыка Совецкага Саюза.

Вастрыё японска-германскага пагаднення накіравана не толькі супроць СССР і Манголыскай народнай Рэспублікі. Яно накіравана таксама супроць Кітая, вялікія багацці якога хоча прысвоіць сабе японскі імперыялізм. Зговар з фашыскай Германіяй толькі заахвочвае Японію да новых авантур і правакацый у Кітаі.

І нарэшце пагаднене ўмацняе японскую агрэсію ва ўсіх кірунках, у тым ліку ў раёне Паўднёвых марэй, дзе знаходзяцца багацейшыя крыніцы сыравіны і буйнейшыя каланіяльныя рынкі.

Філіпінскія астравы, Галандская Індыя, Індакітай, Сіам, Бірма — усе гэтыя краіны і калоніі імперыялістычных дзяржаў прыцягваюць да сябе ўвагу японскіх драпежнікаў. Захватам багатых крыніц нафты, каўчуку, каляровых металаў яны думаюць вырашыць праблему стварэння ўласнай сыравіннай базы.

Экспансія на Поўдзень цесна звязана з імкненнем японскіх імперыялістаў, на поўнач да Совецкага Прымор'я, Далёкага Усхода і з'яўляецца часткай агульнай праграмы ўцвярджэння манапольнага панавання Японіі ў Азіі.

Аўтар прыводзіць рад цікавых лічбаў, ілюструючых, як Японія пранікае ў Сіам, (краіна на поўдні Азіі), як хутка растуць эканамічныя пазіцыі Японіі ў гэтай краіне, якая грае ролю добрага плацдарма для захвату суседніх англа-французскіх калоній і паўднёвых правінцый Кітая.

У сваёй экспансіі на Поўдзень Японія ўваходзіць у сутычку з жыццёвымі інтарэсамі буйнейшых імперыялістычных дзяржаў — Францыі, Англіі, ЗША.

Вось чаму сусветны друк з самага пачатку падкрэсліваў, што японска-германскае пагаднене з'яўляецца пагрозай не толькі СССР, але і ўсяму свету.

У наступным раздзеле А. Барысаў спыняецца на пытанні аб унутраных слабасцях і супярэчнасцях японска-германскага блока. Гэта — слабасць фінансавай і сыравіннай базы, геаграфічная аддалёнасць аднаго саюзніка ад другога, што перашкаджае ў часе вайны ўзаемадапамозе і каардынаванню ваенных дзеянняў.

Адной з гэтых супярэчнасцей, якія перашкаджаюць ажыццяўленню сумесных планаў агрэсіі, з'яўляецца таксама супярніцтва і канкурэнцыя Германіі і Японіі ў Кітаі і паўднёва-заходняй частцы Піхага акіяна.

Германія разглядае Кітай, як самы вялікі ў свеце рынак збыту, у той-жа час Японія прагнае туды свае шчупальцы.

Далей аўтар разглядае пытанні аб іншых сілах, перашкаджаючых развязванню вайны. Гэта, у першую чаргу, жорсткая барацьба ўнутры кіруючага лагера Японіі: авантурыстскія фашыскія элементы армії і фінансавага капітала патрабуюць хуткага сканчэння падрыхтоўкі да вайны і папаракавання ўсёй гаспадаркі гэтай задачы, больш дальнабачныя і цвярозыя буржуазныя колы баяцца ваеннай катастрофы і патрабуюць больш павольнай падрыхтоўкі да вайны і больш асцярожнай знешняй палітыкі. Адстаўка кабінета Хірота і стварэнне ўрада генерала Хаясі з'яўляецца аллюстраваннем гэтай барацьбы ў кіруючых колах.

У той-жа час у дэмакратычным лагеры Японіі, сярод працоўных мас расце і мацнее пята да алізнага народнага фронта, супроць вайны, фашызма і голаду.

Апошні раздзел кнігі прысвечан сувязі антысовецкай трацкісцкай банды з германскай фашыскай ахранкай і японскай ваеншчынай, якія скарыстоўвалі ўдзельнікаў трацкісцкага цэнтра, як сваіх агентаў, дыверсантаў і шпіёнаў.

Знішчэнне трацкісцкай фашыскай банды з'яўляецца несумненным ударам па блоку падпальшчыкаў вайны. Вось чаму прыгавор Вярхоўнага суда вітаюць усе сапраўдныя прыяцелі свету.

— Совецкі народ,—гаворыцца ў заключэнні ў кнізе, — адае сабе поўную справаздачу ў пагрозе вайны, якая зыходзіць ад японска-германскага блока, і адказвае на пагаднене падпальшчыкаў вайны пястомным умацаваннем абароны краіны, сваёй гатоўнасці і рэволюцыйнай пільнасці.

Сіла і магутнасць краіны социялізма несакрушальны!

Кніга можа служыць добрым, карысным дапаможнікам для прапагандыстаў, агітатараў, шырокага партыйна-совецкага актыва і палітработнікаў РСЧА.

Е. БУТОМАЎ.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ЗВАРОТ ЦК ФРАНЦУЗСКАЙ КОМПАРТЫІ ДА II ІНТЭРНАЦЫЯНАЛА

ПАРЫЖ, 9 сакавіка. (Уласны кар. «Правды»). «Юманітэ» публікуе сёння пісьмо, з якім Цэнтральны камітэт французскай камуністычнай партыі звярнуўся да II Інтэрнацыянала. У пісьме гаворыцца:

«Ужо 8 месяцаў рэспубліканская Іспанія супраціўляецца жорсткаму нашэсьцю міжнароднага фашызмам. Іспанскі народ гераічна змагаецца за сваю незалежнасць, за свабоду і ўсеагульны мір. На няшчасце, вайна прымае цяжкі і жорсткі характар. Жанчыны і дзеці гінуць тысячамі, паражоныя бомбамі і снарадам Гітлера і Мусаліні. Гэта — трагічная ілюстрацыя палітыкі так называемага нейтралітэта, ажыццяўляемай па ініцыятыве ўрадаў дэмакратычных краін.

Для выратавання Іспаніі дэмакратыі і свету незбходны абʼяднаныя намаганні ўсіх працоўных у кожнай краіне, а таксама ў міжнародным маштабе.

Мы звяртаемся яшчэ раз да вашай арганізацыі з прапановай ажыццявіць адзінства дзеянняў і стварыць для гэтай мэты міжнародную канферэнцыю з удзелам комуністычных арганізацый. Мы гатовы адначасова прыняць удзел у міжнароднай канферэнцыі ў Лондане».

10 сакавіка ў Лондане адкрываецца нарада другога і Амстэрдамскага Інтэрнацыяналаў, на якім будзе абмяркоўвацца становішча ў Іспаніі.

Н. МАЙОРСКІ.

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

ЗАЯВА ГЕНЕРАЛА МІЯХА

ПАРЫЖ (сталіца Францыі), 9 сакавіка. (БЕЛТА). Агенцтва Гавас паведамляе, што старшыня камітэта абароны Мадрыда генерал Міяха заявіў учора у гутарцы з журналістамі:

«Мяцежнікі пачалі сёння раніцой вялікае наступленне ў раёне Гвадалахары. Гэта — пятая спроба атакаваць сталіцу». Міяха далаў: «Будзьце спакойны. Усё падрыхтавана да аказання супраціўлення як на фронце Гвадалахары, так і ў раёніцах Лас-Росас і ў іншых месцах. Мы сканцэнтравалі значныя сілы ў Лас-Росас і ў раёне ракі Харамы, чакаючы хутка і там атакі праціўніка. Я яшчэ раз заяўляю, што ўсё гатова».

Германскія і італьянскія часці канцэнтруюцца вакол Мадрыда

Згодна паведамленням французскіх газет, у разультаце частковых аперацый урадавых войск дарога з Мадрыда ў Валенсію зараз знаходзіцца па-за абстрэлам артылерыі мяцежнікаў. Дарога зусім бязпасна ад знарадаў і па ёй ідзе зусім нармальны рух.

Аднак рад паведамленняў сведчыць, што сканцэнтраваныя на мадрыдскім фронце войскі мяцежнікаў атрымліваюць у апошнія дні значныя падмацаванні. Да Мадрыда спяшаюцца італьянскія войскі, якія прымалі ўдзел ва ўзяцці Малагі, у колькасці звыш 25 тыс. чалавек. Сюды-ж падвозяцца германскія часці, якія знімаюцца з арагонскага фронта. Канцэнтрацыя войск інтэрвентаў адбываецца як у раёне ракі Харамы — на паўднёвы ўсход ад Мадрыда, так і ў раёне Эль-Пардо і Эль-Планціё — на паўночны захад ад сталіцы. Фашыстскае камандаванне рыхтуецца на гэтых участках зрабіць новую спробу прарыву рэспубліканскіх пазіцый. Згодна заявы старшыні камітэта абароны Мадрыда генерала Міяха, новыя атакі інтэрвентаў і мяцежнікаў не захопяць знянацку войскі рэспубліканскай Іспаніі.

ІТАЛЬЯНСКІЯ ДЫВІЗІІ ПАД МАДРЫДАМ

ВАЛЕНСІЯ, 9 сакавіка. (Спец. кар. «Правды»). На фронце Гвадалахара выяўлена прысутнасць італьянскай дывізіі чорнарубашачнікаў, якая вядзе зараз наступленне. Узяты ў палон сяржант і некалькі салдат гэтай дывізіі. Палонныя на допыце паказвалі, што іх дывізія 22 лютага высадзілася ў Кадыксе, адкуль была накіравана на Гвадалахарскі фронт.

Гэта ўжо другая дывізія рэгулярных італьянскіх войск, прыбыўшая ў Іспанію. Палонныя італьянцы накіраваны для далейшага допыту ў Валенсію.

М. КАЛЬЦОЎ.

ПА НОВАМУ МАРШРУТУ НА СТАРЫ АДРАС

Снабжэнне «добраахвотнікамі» працягваецца. Войскі апрануты ў форму зімежнага зегіна. (З газет). Рыс. Я. Кацкеля.

ЛОНДАНСКІ ТОРМАЗ.

ПЛЕНУМ ЦК ІСПАНСКАЙ КОМПАРТЫІ

ВЫСТУПЛЕННЕ МІНІСТРА ЗЕМЛЯРОБСТВА ВІСЕНТЭ УРЫБЕ

ВАЛЕНСІЯ (горад на ўсходнім узбярэжжы Іспаніі, часовая рэзіднэцыя ўрада) 9 сакавіка. (БЕЛТА). На ўчарашнім пасяджэнні пашыванага пленума ЦК іспанскай компартыі працягваліся спрэчкі па дакладу генеральнага сакратара компартыі Хозэ Дыяса.

З вялікай прамовай выступіў міністр земляробства Вісентэ Урыбе. Ён падкрэсліў, што аграрная праблема стаяла з самага пачатку ў цэнтры ўвагі комуністычнай партыі. Аграрная палітыка партыі з'яўляецца адным з самых рашаючых і магутных фактараў пераможнай барацьбы супроць фашызма.

Палітыка партыі ў вёсцы заключаецца ў наступным: экспрапрыяваць экспрапрыятараў і перадаць асноўны сродак вытворчасці — зямлю тым, хто на ёй працуе».

«Сялянства, — сказаў далей Урыбе, — становіцца неадлучнай сутаўной часткаю народнага фронта. Для комуністычнай партыі заўсёды было галоўным, каб сялянне змагаліся рука аб руку з рабочымі за агульныя інтарэсы. Асабліва важна гэта ў сучасны момант, калі наша партыя, стварыўшая народны фронт, кліча ўвесь іспанскі народ да яднання супроць ворагаў нашай бацькаўшчыны».

Ахарактарызаваўшы выключна пяжкае становішча сялянства ў правінцыях, захваченых фашыстскімі мяцежнікамі, Урыбе заявіў: «На працягу трох ці чатырох месяцаў мы правялі гіганцкую работу па сацыяльна-эканамічнаму вызваленню сялянства. Мы знішчылі латыфундыі (буйныя маёнткі), мы сперлі з твару зямлі феадальныя касты, вывелі праказу лихвярства».

Затым Урыбе апісаў велізарныя цяжкасці, якія прыходзяцца перамагаць урраду пры правядзенні сваёй аграрнай палітыкі. Прыходзіцца змагацца «з бяссававым і злачынным эксперыментаваннем», якое выражаецца ў спробах прымусовай «калектывізацыі», прыходзіцца змагацца са свавольствам розных самачынных камітэтаў. Пры гэтым Урыбе рашуча падкрэсліў, што комуністы, якія працуюць у міністэрстве земляробства, аказваюць усякую дапамогу сялянам, якія пажадалі-б арганізаваць калектыўныя гаспадаркі на сьайму ўласнаму і свабоднаму выбору, але ні ў якім выпадку не падтрымаюць прымусовай калектывізацыі, бо гэта, сказаў Урыбе, «роўнасільна правакаванню грамадзянскай вайны ў вёсцы».

«Мы смела можам сказаць, што, дзякуючы нашай аграрнай палітыцы, мы здолелі ўнікнуць грамадзянскай вайны ў рэспубліканскім тылу».

З няменшай рашучасцю Урыбе падкрэсліў, што арэндная плата поўнасцю адменена ў Іспаніі: усякі, хто патрабуе зараз ад сялян уняцення арэндай платы, робіць акт грабяжу.

Апрача таго, на пасяджэнні выступілі член палітбюро ЦК іспанскай компартыі Антоніо Міхе, прадстаўнікі правінцый Аліканте, Галісіі і Канарскіх астравоў.

Пленум вітала дэлегацыя французскіх і бельгійскіх сацыялістаў.

У лонданскім камітэце

ЛОНДАН (сталіца Англіі), 9 сакавіка. (БЕЛТА). Адкрылася пленарнае пасяджэнне камітэта па неўмяшанню з удзелам 27 дзяржаў.

Старшыня Плімут далажыў прыняты падкамісіяй праект схемы кантролю, падкрэсліўшы, што рашэнне камітэта аб кантролі павінна сурова выконвацца ўсімі яго членамі і што невыкананне гэтых рашэнняў кім-небудзь з членаў вызваляе і іншых членаў ад прынятых на сябе абавязацельстваў. У гэтым выпадку кожны член камітэта зварочвае сабе свабоду дзеянняў.

Пасля прыняцця схемы кантролю прадстаўнік СССР Майскі выступіў з прамовай, у якой вітаючы прынятае камітэтам рашэнне, заявіў, аднак, што зараз, як і раней, савецкі ўрад будзе лічыць сябе звязаным рашэннямі камітэта толькі пастолькі, паколькі гэтыя рашэнні будуць выконвацца таксама і ўсімі іншымі яго членамі. У працўным выпадку Савецкі ўрад будзе лічыць сябе маральна свабодным ад прынятых абавязацельстваў.

ТАКТЫЧНЫЯ ВУЧЭННІ Ў ЧАСЦЯХ БВА

ВОЙСКІ ЗАНЯЛІ ЗЫХОДНАЕ СТАНОВІШЧА

РАЕН ВУЧЭННЯЎ. (Па тэлефону ад нашых спец. кораў). Сёння на світанні пачнуцца зімовыя тактычныя вучэнні часцей БВА. Учора ў выключна пяжкай абстаноўцы, па размытых дарогах, з вялікім талым снегам, часці сканцэнтраваліся на зыходных рубяжах.

Заняткі прайшлі арганізавана. Сярод байцоў не было адстаючых. Усе яны былі натхнёны вялікім парывам: на «выдатна» выканаць баявыя задачы вучэнняў. У падразделяннях шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва. Учора ўвечары ў месцы размяшчэння часцей адбыліся вечары самадзейнасці, гутаркі, калектыўныя чыткі газет байцоў разам з калгаснікамі.

П. ТУРСКІ,
Н. ВІШНЕЎСКІ.

ЗАЎСЁДЫ НА ВАРЦЕ

На нас, калгаснік пагранічных калгасаў, вышаў ганаровы абавязак заўсёды быць на варце і дапамагаць слаўным чырвоным пагранічнікам пільна ахоўваць граніцы сацыялістычнай бацькаўшчыны. І мы, калгаснікі, з гонарам выконваем гэты ганаровы абавязак, з гонарам дапамагаем пагранічнікам несці пагранічную службу. Я хачу расказаць жанчынам Совецкай Беларусі, як я, калгасніца, выконваю гэты ганаровы абавязак.

Аднаго разу, увосень, да выхаду на калгасную работу, я вышла з матыгай на свой агарод капаць бульбу. Бачу, да граніцы подбегам спяшаецца незнаёмы чалавек. Я яму наперад. Дзядзька, куды вы ідзеце? — пытаю яго. Ён маўчыць. Я зноў пытаю.

— Дзе я? — пытае ён у мяне, — мне трэба прайсці ў вёску (паказвае па той бок граніцы). Дайце я вам пакажу дарогу—прапанавала я свае паслугі. Пайшлі. Узыходзячы на ўзгорак, ён заўважыў палыхаючы чырвоны сцяг на пагранічнай заставе. Адразу ўвесь неяк закалаціўся, і давай наўцёкі. Я за ім. Куды вы бяжыце — усёроўна вам не ўцячы, — напаражваю яго. Не хвалюйцеся, я вас непрыкметна правяду каля заставы. Ён згадзіўся. І калі мы падышлі да самай заставы, я акліканула пагранічнікаў, і яго тут-жа забралі.

Такім-жа чынам я дапамагла пагранічнікам затрымаць яшчэ двух парушальнікаў граніцы. Заўсёды ўдарна працуючы ў калгасе, я не лічуся ні з чым, толькі каб лепш выконваць свой ганаровы абавязак перад радзімай, дапамагаць пагранічнікам ахоўваць совецкую зямлю, раднае і заможнае жыццё калгаснікаў.

Марыя АХРЭМ,
калгасніца калгаса «Чырвоны пагранічнік» Дзержынскага раёна.

НАСУСТРАЧ НАВІГАЦЫІ

Зусім мала часу асталося да пачатку навігацыі. Карэспандэнт «Звязды» звязаўся па тэлефону з кіраўніцтвам Днепра-Дзвінскага параходства ў Гомелі і з начальнікамі раду прыстаней. Начальнік Днепра-Дзвінскага параходства тав. Обухаў паведаміў, што ўскрыццё рэк БССР і пачатак навігацыі чакаецца паміж 25 сакавіка і 1 красавіка.

Рабочыя, служачыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі і камандзіры параходства пашер усе сілы аддаюць на ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ворагаў народу — трацкістаў на чале з былым начальнікам параходства Галаванавым.

У сучасны момант рамонт флота выканан на 90 проц. і запоўнен новымі буксірнымі газаходамі. Паток грузаперавозак у гэтым годзе складзе 1.430 тыс. тон. На жаль, грузы да прыстаней падвозяцца пакуль слаба. Гомельская прыстань арганізавала прыёмку грузаў на бясплатнае хаванне. Рачны вакзал Гомель адрамантуецца і будзе лепш абсталёван.

— Ускрыццё ракі Бярэзіна, — як паведаміў начальнік бабруйскай прыстані тав. Розенбаум, — чакаецца ў канцы сакавіка. Адбылася папярэдняя прыёмка адрамантаваных суднаў. У навігацыйны перыяд 1937 г. праз прыстань Бабруйск павінна будзе быць прапушчана 300 тыс. тон грузу. Кліентура, як «Шахталес», дрэваапрацоўчы камбінат, кантора лесасплава і інш., тармозіць своечасовую загатоўку грузаў. На сёнешні дзень на прыстані загатоўлена толькі 35 тыс. тон грузу.

— Лёд на Заходняй Дзвіне пакуль яшчэ моцны, — паведаміў нам начальнік віцебскай прыстані тав. Картушавіч. Рух на ільду інтэнсіўны: возяць грузы на санях і грузавых аўтамашынах. Рамонт флота выканан толькі на 80 проц. Для нас вельмі актуальнае пытанне пабудовы рачнога вакзала, бо існуючы—дэбаркадэр — не задаволіць паток пасажыраў (прыблізна звыш 70 тыс. чалавек). Аднак віцебскія арганізацыі не ідуць нам насустрач, каб чабудаваць рачны вакзал. Намі атрыманы новыя водныя трамваі для прыгараднага руху.

ПАДАРУНАК З'ЕЗДУ АСОАВІЯХІМА

Жанчыны-ўдарніцы абаронкай работы Менска рыхтуюць арыгінальны падарунак III Усесаюзнаму з'езду Асоавіяхіма. Па эскізу мастака Гусева і пад непасрэдным кіраўніцтвам мастака Мурашова 18 жанчын — жонак работнікаў Асоавіяхіма і камандзіраў Чырвонай Арміі — выпяўваюць вялікі мастацка афармлены партрэт таварыша Сталіна. У выпяўцы актыўна прымаюць удзел тт. Берг, Ступіна, Шац, Дзякава, Драгун, Шаркоўская, Лукашэвіч, 14-гадовая Геля Кузняцова і інш. Партрэт будзе закончан к канцу сакавіка.

РОСТ НАРАДЖАЛЬНАСЦІ Ў БССР

Па даных кіраўніцтва Наргасуната ў 1936 годзе па БССР нарадзілася на 20.970 чалавек больш чым у 1935 годзе.

Колькасць разводаў паменшылася ў 1936 годзе ў параўнанні з папярэднім годам на 2.736.

179 КІЛАМЕТРАЎ ЗА 24 ГАДЗІНЫ

Выключна выдатны пераход на лыжах зрабілі гэтымі днямі тры фізкультурнікі БВА тт. Ганюшкін — лейтэнант, Тарасевіч — малодшы камандзір і Бегуноў—чырвонаармеец.

За 24 гадзіны з кароткімі адпачынкамі яны прайшлі 179 кіламетраў 100 метраў і ўсе трое прышлі да фініша захалбашы сілы, здольнымі прадаўжаць шлях. Гэты пераход бліскуча характарызуе выключную вынослівасць, упартасць і сілу байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі. Гэтым пераходам фізкультурнікі БВА дасягнулі новага выдатнага рэкорда.

НАВІНЫ ГАНДЛЮ

Завоз мандарынаў. У Менск прыбыў вагон мандарын. Да канца сакавіка ў БССР будзе завезена яшчэ 6 вагонаў мандарын, з якіх 4 вагоны для Менска. Таксама будзе завезена 4 вагоны лімонаў.

СПАБОРНІЦТВЫ ПЛАЎЦОЎ

8 сакавіка ў басейне менскага ДЧА імя К. Е. Варашылава пачаліся спаборніцтвы плаўцоў БВА. Звыш 50 прадстаўнікоў злучэнняў БВА сабраліся залоўта да спякотнага лета, каб пазнаёміцца са стылем плавання, тэхнікай майстроў водзнага спорта, вопытам арганізацыі масавага навучання плаванню і здачы норм.

Ужо ў першы дзень збораў устаноўлены, рад новых усебеларускіх рэкордаў. Тав. Верата праплыла пад вадой 25 метраў за 21 секунду. Тав. Капуспін у вольным стылі 100-метравую пыстанцыю прайшоў за 1 мінуту 2 секунды. Гэты разультат значна перавышае рэкорд БССР і ўшчыльную прыбліжаецца да ўсесаюзнага рэкорда.

100 метраў стылем «брас» за 1 мінуту 18,3 секунды праплыў т. Кандрацьеў. 50 метраў на спіне за 46,7 секунды праплыла Верата. 50 метраў вольным стылем т. Юхіменка плыла 36,9 секунды. 100 метраў на баку за 1 мінуту 18,2 секунды праплыў Шабашоў. На спіне 100 метраў 1 мінуту 21,8 секунды плыў Сямёнаў.

Дасягненні таварышоў Кандрацьева, Верата, Юхіменка, Шабашова і Сямёнава — новыя ўсебеларускія рэкорды.

Таксама новым усебеларускім рэкордам з'яўляецца разультат каманды ў складзе Капуспіна, Мамад, Сямёнава і Лунёва, праплыўшай пыстанцыю эстафеты 4×50 м. за 1 мінуту 59,3 секунды.

18 сакавіка працяг спаборніцтваў па плаванню, прыжках з вышкі і нырэнню.

НОВЫЯ КНІГІ

БАНКІ ГЕРМАНІІ

Сэкцыя выпусціў кнігу аб банках Германіі ў перыяд агульнага крызіса капіталізма Р. Жукоўскай.

Кніга Р. Жукоўскай прысвечана аналізу банкаўскай сістэмы пасляваеннай Германіі і крэдытнай палітыцы германскага фашызма.

Аўтар абрысоўвае спецыфічныя рысы банкаўскай і крэдытнай сферы пасляваеннай Германіі і прычыны банкаўскай катастрофы ў перыяд крызіса.

У апошнім раздзеле аўтар асвятляе крэдытную палітыку германскага фашызма, якая з'яўляецца адным з важнейшых вагавоў падрыхтоўкі Германіі да новай імперыялістычнай вайны.

СУДЛЗЯ-ХАБАРНІК

14 сакавіка выязная сесія судовай калегіі Вярхоўнага суда БССР у г. Слуцку пачынае слухаць справу былога нарсудзяі Слуцкага раёна Фралова В. А., які за хабар апраўдваў злачынцаў, выносіў мяккія прыгаворы п'янствавай сумесна з абаронцам Шабесам на кватэрах падсудных, выключна груба і бюракратычна адносіўся да скарг працоўных.

Да судовай адказнасці па гэтай справе прыцягнута 8 чалавек.

ДЗЕННІК

— **Семінар для прапагандыстаў** па вывучэнню гісторыі партыі ў школах комсамольскай сеткі палітасветы адбудзецца 11 сакавіка ў 7 гадзін вечара ў памяшканні Дома партактыва (пакой 18).

Сталінскі РК КП(б)Б і РК ЛКСМБ.

— **Кансультацыя для прапагандыстаў і аўтатараў** на тэму: Рашэнні лютаўскага пленума ЦК ВКП(б) і па пытанню міжнароднага становішча адбудзецца 12 сакавіка ў 2 гадзіны дня ў памяшканні Дома партактыва (пакой 21).

— **Літаратурны вечар на тэму: «Народжаныя бурай»** па кнізе Н. Остроўскага адбудзецца 12 сакавіка ў 7 гадзін вечара ў вялікім залі Дома партактыва.

Білеты можна атрымаць у Доме партактыва і горрайкомах КП(б)Б.

Адказны рэдактар Д. В. ЮРКОЎ.

СЕННЯ Ў ТЭАТРАХ І КІНО

БЕЛАРУСКІ ПЕРШЫ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР (БДТ-1)
ВАЎКІ І АВЕЧКІ
Абанемент № 54

Гукавы кінатэатр «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА»
ДАРЫКО

Даіцячы гукавы кінатэатр
САПРАЎДНЫ ТАВАРЫШ

Гукавы кінатэатр «Пролетарый»
АПОШНЯЯ НОЧ

Гукавы кінатэатр «Інтэрнацыянал»
ЮНАЦТВА МАКСІМА

Гукавы кінатэатр «Спартак»
ДЗЯЎЧЫНА СПЯШАЕЦЦА НА СПАТКАННЕ

РАДЫЕПЕРАДАЧЫ НА 12 САКАВІКА
8.30 — «Апошнія паведамленні», 10.30—канцэрт для дзяцей, 16.00—канцэрт па заяўках радыёслухачоў, 17.15 — творы Лыжкова і Галавача на яўрэйскай мове, 18.15 — міжнародны агляд, 18-30—рэвалюцыйныя песні, 19.00—паэма Маякоўскага «Хорошо».

БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ ЎСЕСАЮЗНАГА ІНСТЫТУТА ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ І ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ НАРКАМЗЕМА СССР ПРЫ БЕЛАРУСКІМ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ ІНСТЫТУЦЕ

абвяшчае АСЕННІ ПРЫЁМ

I. НА ЗАВОЧНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ЗА 1 КУРС ВНУ
На спецыяльнасцях: жывёлагадоўлі, паляводства з папярэднімі іспытамі (заочна) ў абʼёме курса сярэдняй школы па палітграмаце, беларускай і рускай мовах, матэматыцы, фізіцы, хіміі, геаграфіі і літаратуры.
Тэрмін навучання ад 5 да 6 і од.
II. НА ЗАВОЧНАЕ ПАВЫШЭННЕ КВАЛІФІКАЦЫІ сельскагаспадарчых спецыялістаў з закончанай вышэйшай і сярэдняй сельскагаспадарчай асветай.
Тэрмін навучання на курсах 6 месяцаў.
Паступаючыя падаюць дакументы: заяву, засведчаную аўтабіяграфію, пасведчанне аб адукацыі (арыгінал), метрычны выпіс, даведку з месца работы, а камандзіруемыя і камандзіроўку.
Прыём заяў да 1 ліпеня 1937 года.
Аб падрабязнасцях прыёму і навучання можна даведацца ў мясцовым райвА, МТС, а таксама ў аддзяленні па адрасу:
БССР, г. Горкі, сельскагаспадарчы інстытут, заочнаму аддзяленню.
Для адказу высылайце 40 кап. паштовымі маркамі.

НА ПАДСТАВЕ ЗАГАДА НКУГ БССР ЗА № 203
БЕЛПЛОДГАРОДГАНДАЛЬ
ЛІКВІДУЕЦЦА.
УСЕ АРГАНІЗАЦЫІ І АСОБЫ, ЯКІЯ МАЮЦЬ ПРЭТЭНЗІІ, ПАВІННЫ ПРАД'ЯВІЦЬ ІХ НЕ ПАЗНЕЙ 1 КРАСАВІКА 1937 года ПА АДРАСУ: г. МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 46.
ЛІКВІДКОМ.

УСЕ НА ВЫСТАЎКУ!
З 12 САКАВІКА (вул. Кірава, 12,
БЕЛШВЕЙТРЭСТАМ
БШ БЕЛАРУСКІ ШВЕЙТРЭСТ
УСЕ НА ВЫСТАЎКУ!
У КЛУБЕ МЕТАЛІСТАЎ (радам з стадыёнам „ДЫНАМА„)
АДКРЫВАЕЦЦА
—ВЫСТАЎКА—
МАДЗЛЯЎ ФАСОНАЎ ШВЕЙНЫХ ВЫРАБАЎ
МУЖЧЫНСКАГА, ЖАНОЧАГА І ДЗІЦЯЧАГА АСАРТЫМЕНТУ
ДЛЯ ЗАЦВЕРДЖАННЯ НА АСЕННЕ-ЗІМОВЫ СЕЗОН 2-га ПАЎГОДДЗЯ 1937 г.
ВЫСТАЎКА БУДЗЕ АДКРЫТА ШТОДЗЕННА ДА 21 САКАВІКА г. г. З 11 гадзін РАНІЦЫ да 11 гадзін ВЕЧАРА.
ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуюць ЭКСКУРСАВОДЫ
ПРЫ ВЫСТАЎЦЫ працуе ВЕШАЛКА. УВАХОД ВОЛЬНЫ.
БЕЛШВЕЙТРЭСТ.

На падставе пастановы СНК СССР і загада Народнага камісарыята зернавых і жывёлагадоўчых саўгасаў СССР ад 8 студзеня 1937 г. № 8,
СВІНАВОДЧЫ СОЎГАС ХАЛОПЕНІЧЫ, Глускага раёна (БССР)
ЛІКВІДУЕЦЦА.
ПРЭТЭНЗІІ да ліквідуемага саўгаса трэба накіроўваць ДА 25 САКАВІКА 1937 г. упаўнаважанаму па ліквідацыі т. Ласенкову па адрасу: п/а Глуск, Глускага раёна, БССР.
Пасля ўказанага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.
ЛІКВІДКОМ.

Згублена круглая пячатка калгаса «Луч сацыялізма», Астрашына-Гарадзецкага сельсавета, Менскага раёна. Лічыць несапраўдзнай.

Украдзены вуглавы штамп і штамп для пакетаў Менскага міжраённага агенцтва па кіраўніцтву вясковай гаспадаркай лічыць несапраўднымі.

НКУГ СССР
МАГАЗІН № 71,
„СОЮЗМЕТИЗСТРОЙТОРГ"
БУДМАТЭРЫЯЛАЎ
ПЛЯЦ ВОЛІ, 29-31.
ПРЫ МАГАЗІНЕ АРГАНІЗАВАНЫ
БРЫГАДЫ па РАМОНТУ КВАТЭР
(ПАБЕЛКА, АКЛЕЙКА, МАЛЯРНЫЯ І ШКЛЯРНЫЯ РАБОТЫ) ПА АДЗІНЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ РАСЦЭНКАХ.
МАГАЗІН ПОЎНАСЦЮ ЗАБЯСПЕЧВАЕ ВЫСОКАЯКАСНЫМІ МАТЭРЫЯЛАМІ ДЛЯ УКАЗАНЫХ РАБОТ, ГАРАНТУЕ ЯКАСЦЬ І СВОЕЧАСОВАЕ ВЫКАНАННЕ РАБОТ.
ПРЫ МАГАЗІНЕ ЁСЦЬ ТЭХНІК, ЯКІ БЯСПЛАТНА СКЛАДАЕ КАШТАРЫСЫ І ДАЕ КАНСУЛЬТАЦЫЮ ПА РАМОНТУ КВАТЭР І ПАТРЭБНАСЦІ МАТЭРЫЯЛАЎ.
ДАВЕДКІ МОЖНА АТРЫМАЦЬ У САМЫМ МАГАЗІНЕ І ПА ТЭЛЕФОНУ 25-155.
ДЫРЭКЦЫЯ.

У аддзел аб'яў звяніце па тэл. 21-845

МЕНСКІ трансляцыйны РАДЫЁВУЗЕЛ
ДА ЎВАГІ РАДЫЁСЛУХАЧОЎ!
папярэджвае і просіць НЕ РАБІЦЬ ніякіх разлікаў з работнікамі радыёвузла на кватэрах, а таксама НЕ ДАЗВАЛЯЦЬ ім ЗНІМАЦЬ і ВЫНОСІЦЬ з сабой ніякіх прадметаў унутранага радыёабсталявання ў кватэрах.
УСЕ РАЗЛІКІ неабходна рабіць толькі ў касе радыёвузла
КАСА АДКРЫТА БЕЗ ПЕРАПЫНКУ З 9 ДА 18 ГАДЗІН ШТОДЗЕННА, АПРАЧА АГУЛЬНАВЫХОДНЫХ ДЗЁН; У АГУЛЬНАВЫХОДНЫЯ ДНІ КАСА АДКРЫТА З 9 ДА 16 ГАДЗІН.
АДРАС радыё-трансляцыйнага вузла: МЕНСК, СОВЕЦКАЯ, 47, ТРЭЦІ ПАВЕРХ.

ДА ЎВАГІ ГАСПАДАРНІКАЎ!
У рамонтных майстэрнях МЕНГОРСОВЕТА
ЗНАЧНА ЗНІЖАНЫ АДПУСКНЫЯ ЦЭНЫ НА РАМОНТ
ПІШУЧЫХ МАШЫНАК І АРЫФМОМЕТРАЎ
(АД 10 ДА 25 ПРОЦ.) НА 1937 г.
ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА АКУРАТНА, У ТЭРМІН І З ГАРАНТЫЯЙ.
ТЭРМІНОВЫЯ ЗАКАЗЫ ВЫКОНВАЮЦЦА У 2—3 ДНІ
ДРОБНЫЯ ЗАКАЗЫ выконваюцца НА МЕСЦЫ па выкліку механіка (тэл. 22-302)
ПРЫМАЮЦЦА ТАКСАМА ЗАКАЗЫ НА РАМОНТ КАСАВЫХ АПАРАТАЎ, ШЧОТНЫХ МАШЫН «ДСМ», ВЕЛАСІПЕДАЎ, НІКЕЛІРОЎКУ І УСЯКІЯ ТАКАРНА-МЕХАНІЧНЫЯ І КАВАЛЬСКІЯ РАБОТЫ.
АДРАС МАЙСТЭРАНЬ: МЕНСК, КОМСАМОЛЬСКАЯ, 2/15, тэл. 22-302.
МЕНСК, НЯМІГА, 37, тэлефон 22-137.

Уп. Галоўлітбела № К—587. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 63. К. К. С.